# Амерыканская кампанія «PSS World Medical» прапануе Беларусі супрацоўніцтва ў вырабе медыцынскіх прэпаратаў і абсталявання

Аб гэтым ішла размова 16 лістапада на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніцтвам кампаній «ІТЭРА» і «PSS World Medical».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі аказваецца сур'ёзная падтрымка прадпрыемствам, якія прыходзяць з імпартазамяшчальнай прадукцыяй і працуюць на экспарт. «Калі ва ўмовах канкурэнцыі вы пераможаце, пакідайце сваю прадукцыю, колькі хочаце. Калі вам патрэбна наша дзяржаўная падтрымка ў плане пастаўкі лекавых прэпаратаў і медыцынскай тэхнікі, то мы аказваем такую падтрымку замежным прадпрыемствам, але вы павінны прапанаваць цану ніжэйшую за цяперашнія пастаўкі. Тады будзе матывацыя перад людзьмі, што я падтрымліваю ваша прадпрыемства. А далей — свабодная канкурэнцыя», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Што датычыцца будаўніцтва ў Беларусі прадпрыемстваў па выпуску медыцынскай прадукцыі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Ведаю, што вы пабудуеце прадпрыемства, якое будзе экспартаарыентаваным, і будзеце выпускаць тую прадукцыю, якой няма ў Беларусі, таму атрымаеце значныя ў гэтым плане прэферэнцыі. І тут мы будзем вас сур'ёзна падтрымліваць і будзем ставіцца да вас як да свайго прадпрыемства».

У сваю чаргу кіраўніцтва кампаніі «PSS World Medical» адзначыла, што ў іх ёсць прапановы па выпуску прадукцыі (грунтуючыся на беларускія рэсурсы) і пастаўках яе ў ЗША і іншыя краіны. Кампанія «Physician Sales & Service (PSS) World Medical» з'яўляецца лідарам на рынку ЗША ў галіне паставак медыцынскай прадукцыі.

**БЕЛТА.**

# Генерал-маёр Сяргей Бобрыкаў назначаны начальнікам Ваеннай акадэміі Беларусі

Кіраўнік дзяржавы назначыў генерал-маёра Сяргея Бобрыкава начальнікам Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, вызваліўшы яго ад пасады начальніка 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў Узброеных Сілаў. Узначаліць гэты цэнтр палкоўнік Валерый Гнілазуб. Аляксандр Лукашэнка назначыў генерал-маёра Сяргея Лемяшэўскага начальнікам Галоўнага штаба — першым намеснікам камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сілаў, вызваліўшы яго ад пасады камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўна-тактычнага камандавання Ваенна-паветраных сілаў і войскаў проціпаветранай абароны Узброеных Сілаў. Гэту пасаду зойме палкоўнік Аляксандр Пашукевіч.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Далейшае развіццё адносінаў Беларусі з ЗША залежыць ад дзеянняў амерыканскага боку

**Захад абсалютна не разумее і не ўяўляе, якія працэсы адбываюцца ў Беларусі. Такую думку выказаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю газеце «The Wall Street Journal», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

«Захад патрабаваў ад нас вызваліць Казуліна, плюс яшчэ (незразумела толькі навошта?) бізнэсменаў, якія парушылі падатковае заканадаўства. За такія парушэнні ў Амерыцы людзі няхутка выйшлі б з турмы. Яны цалкам па справе былі асуджаны. Нікому не дадзена права ўзрываць на спакойных мінскіх вуліцах выбуховыя ўстройствы, нікому не дадзена права парушаць падатковае заканадаўства. Як у Амерыцы, так і ў нас такіх парушэнняў хапае. Але чамусьці Захад убачыў у гэтым палітычны падтэкст. Добра, убачылі палітычны падтэкст і думалі, што калі Прэзідэнт выпусціць іх (так званых палітзняволеных), то яны перавернуць краіну і зусім іншая сітуацыя тут складзецца. Мы іх вызвалілі задоўга да парламенцкіх выбараў. Скажыце, што яны перавярнулі ў краіне? Вось факт таго, што Захад не разумее, што адбываецца ў Беларусі, і няправільна ацэньвае ролю і значнасць некаторых палітыкаў. Захад яшчэ раз пераканаўся, што не толькі яны, але і ўся наша так званая апазіцыя, якая ходзіць да амерыканцаў, да еўрапейцаў, каб ім толькі выдзелілі якія-небудзь сродкі на існаванне, нічога не можа зрабіць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама дадаў: «А калі ўжо Захад на вызваленні Казуліна настойваў і ў залежнасць ад гэтага ставіў вырашэнне сур'ёзных праблем у адносінах з Беларуссю, няўжо для нас гэта праблема? Добра, адпусцілі. І атрымалі ад гэтага вялікія палітычныя дывідэнды. А Захад яшчэ раз пераканаўся, што ні ён, ніхто іншы, хто стаіць з ім побач, — яны нічога тут не варты. Яны сёння ўжо адыграныя фігуры. Мы ж атрымалі станоўчы эфект. І Захад гэта ацаніў як рух да дэмакратыі».

Пры гэтым Прэзідэнт задаў рэзоннае пытанне: аб якіх палітзняволеных можа ісці размова, калі ёсць канкрэтны артыкул у Крымінальным кодэксе? «Мы ж не ўтойваем, за што яны асуджаны, і ёсць матэрыялы, у тым ліку і відэаматэрыялы. Ад гэтага ж нікуды не пойдзеш. Еўропа і Амерыка расцанілі нашы дзеянні як крок Беларусі ў нармальным напрамку. Дзякуй ім за гэта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Далейшае развіццё адносінаў Беларусі са Злучанымі Штатамі Амерыкі залежыць ад дзеянняў амерыканскага боку.

«Усё залежыць ад Амерыкі. Калі Амерыка зацікаўлена ў развіцці адносінаў з намі без выбудоўвання якіх-небудзь дадатковых бар'ераў і папярэдніх умоў, то мы сур'ёзна ў гэтым плане рушым наперад, і амерыканцы будуць задаволены супрацоўніцтвам з Беларуссю», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што Беларусь і ЗША павінны вярнуцца да таго этапа і якасці ў адносінах, якія былі да крызісу, і пачаць весці дыялог. «Я думаю, амерыканцы зразумелі, што Беларусь — ключавая краіна ў Еўропе і з ёй трэба супрацоўнічаць», — дадаў ён.

Што датычыцца скарачэння штату амерыканскага пасольства ў Беларусі і беларускага ў ЗША, Прэзідэнт заўважыў, што «невырашальных пытанняў няма». «Дапусцім, Дзярждэпартамент ЗША ведае, што мы хочам бачыць ад амерыканцаў, і яны ведаюць, якія патрабаванні ў нас тут да Злучаных Штатаў Амерыкі. Мы ведаем іх патрабаванні. Таму тут трэба заканчваць гэты працэс і дамаўляцца. Мы павінны пачаць дыялог», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Пасольства для таго і існуе, каб нармалізоўваць, устанаўліваць добрыя адносіны паміж дзяржавамі. Мы гатовы ў гэтым напрамку рухацца. Але зноў жа — мяч на полі амерыканцаў», — падвёў вынікі Прэзідэнт.

«Калі б не санкцыі, то ў гэтым годзе мы паставілі б на амерыканскі рынак прадукцыі на суму каля мільярда долараў. Мы маглі б мець 10 мільярдаў з Амерыкай тавараабароту і перспектывы ў гэтых адносінах вельмі вялікія. Інвестыцыі амерыканскія важныя. Для нас вельмі важна высокатэхналагічнае абсталяванне, якое вырабляецца ў ЗША. Але калі амерыканцы не будуць яго пастаўляць, мы яго знойдзем у Еўропе, а не ў Еўропе — дык у Азіі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«У гандлі з Амерыкай, паўтараю, у нас вялікія перспектывы. Што такое мільярд для ЗША і Беларусі, калі мы з Расіяй маем сёння пад $35 млрд тавараабарот?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што Беларусі ўдалося дыверсіфікаваць свой экспарт. «Калі ў цэлым гаварыць, то мы сёння ўжо менш за палову экспартнай прадукцыі пастаўляем у Расію. А раней 80 працэнтаў пастаўлялі. Цяпер прыкладна столькі, колькі і ў Расію, мы пастаўляем у Еўрапейскі саюз», — сказаў Прэзідэнт.

Адмова Міжнароднага валютнага фонду ў выдачы Беларусі крэдыту будзе рашэннем, абумоўленым палітыкай, а не эканамічнымі прычынамі. Такую думку выказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Міжнародны валютны фонд прызнаў прагрэс Беларусі па ўсіх напрамках. «Перагаворы завяршаюцца, наш прагрэс яны прызналі па ўсіх напрамках. Так, яны нам робяць некаторыя заўвагі, часам справядлівыя, і мы на іх неадкладна рэагуем».

Паводле слоў Прэзідэнта, адной з заўваг МВФ да Беларусі стала павышэнне ў лістападзе ва ўмовах крызісу заработнай платы. «Але ў нас людзі не такія багатыя, нават калі мы і павысілі гэту заработную плату, дык гэта не намнога. Яны маюць рацыю, што ва ўмовах крызісу заработную плату не павышаюць. Аднак мы гэта рашэнне прынялі яшчэ да фінансавага крызісу ў Еўропе і Амерыцы. Таму яго цяпер адмяняць няправільна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Незадаволены МВФ і вельмі нізкім узроўнем аплаты насельніцтвам камунальных паслуг. Аляксандр Лукашэнка прызнае справядлівасць гэтых заўваг. Аднак, паводле яго слоў, «наша насельніцтва не такое багатае, каб поўнасцю аплачваць камунальныя паслугі». «Хоць мы паступова і павышаем гэту плату. Памалу і мы, як і вы, прыйдзем з часам да таго, што наша насельніцтва будзе на 100 працэнтаў разлічвацца за камунальныя паслугі. А пакуль гэта не так, і заўвагі гэтыя мы прымаем», — адзначыў беларускі лідар.

Што ж датычыцца крэдытаў МВФ, то, на думку Прэзідэнта, Беларусь «абыходзілася без іх і раней, у вельмі цяжкія для рэспублікі часы».

«Цяпер не дадуць — дык мы будзем з гэтага зыходзіць у супрацоўніцтве з МВФ, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я як Прэзідэнт, кіраўнік дзяржавы, папярэдзіў і ўрад, і старшыню Нацыянальнага банка, калі ў гэтай сітуацыі, пры нашай сітуацыі (а яна не такая, як у іншых дзяржавах, якім яны выдаюць крэдыты) яны нам не дапамогуць, то навошта нам гэта супрацоўніцтва? Мы з'яўляемся членам МВФ, узносы плацім, рэгулярна прысутнічаем на пасяджэннях Міжнароднага валютнага фонду. Дык навошта гэта, калі да нас будзе такое стаўленне?»

«Сёння цэны на вуглевадародную сыравіну значна знізіліся. Я не думаю, што будзе правільным, калі Расія ўзніме ў гэтай сітуацыі цэны на прыродны газ. Вы ведаеце, што цана, якая закладзена ў нашым бюджэце, — гэта $140».

На яго думку, пытанне цаны газу — гэта, перш за ўсё, пытанне прысутнасці беларускіх тавараў на расійскім рынку. «Калі ў Беларусі будзе ў 2-3 разы цана на газ вышэйшая, чым у расійскіх спажыўцоў, то як мы зможам канкурыраваць з імі на расійскім рынку? І што гэта тады за адзіная Саюзная дзяржава, калі ёсць такая розніца? Правільна пастаўлена пытанне? Правільна. Тым больш, што мы некалі дамовіліся, што ў суб'ектаў гаспадарання і ў Расіі, і ў Беларусі павінны быць аднолькавыя ўмовы, у тым ліку і па цане на энергасыравіну. Таму калі мы хочам рухацца ў Саюзе, то тут павінны быць роўныя ўмовы. Няхай па 200, па 300 долараў газ, але гэта павінны быць аднолькавыя ўмовы як у Расіі, так і ў Беларусі», — пераканаваны Прэзідэнт.

Адказваючы на пытанне аб выказаных нядаўна ў Расіі прапановах па змяненні Канстытуцыі РФ, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «ацэньвае гэта спакойна».

«Хочуць яны змяніць Канстытуцыю, прадоўжыць прэзідэнцкі тэрмін да 6 гадоў, а тэрмін паўнамоцтваў заканадаўчага органа да 5 — калі ласка, гэта іх справа. Думаю, для нас гэта не прынцыповае пытанне. У нас з Расіяй няма якіх-небудзь незразумелых пытанняў у адносінах — абсалютна ўсё зразумела, хоць мы не пра ўсё можам дамовіцца адразу, здараюцца і нейкія там супярэчнасці. Але мы абсалютна разумеем адзін аднаго», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

## Абзац

■ Амаль тысяча студэнтаў Полацкага дзяржуніверсітэта ўчора, у міжнародны дзень студэнтаў, адначасова абнялі сваю ВНУ. Незвычайная акцыя прайшла пад дэвізам «Люблю свой універсітэт». З трох навучальных карпусоў ВНУ быў выбраны новы корпус у Наваполацку, яго даўжыня па перыметры складае 560 м. Вясёлае віншаванне alma mater адбылося падчас вялікага перапынку. У ім узяў удзел практычна кожны чацвёрты студэнт дзённага аддзялення.

■ **Старшыня СВК «Лебядзянка» Бялыніцкага раёна загінуў у аўтакатастрофе. На аўтадарозе Мінск — Магілёў каля Бялынічаў ён на службовым аўтамабілі ВАЗ-2107 выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з грузавым аўтамабілем «Сканія», у выніку чаго загінуў на месцы. Паводле папярэдніх даных, трагедыя адбылася з-за таго, што 40-гадовы загінулы на некалькі імгненняў адцягнуў увагу ад кіравання машынай або заснуў. Алкаголю ў яго крыві не выяўлена. Вядзецца следства.**

■ Сям'я з Бешанковіцкага раёна ледзь не павячэрала макаронай з ртуццю. 35-гадовая жыхарка вёскі Вярхоўе, прыгатаваўшы гэтую няхітрую страву і пачаўшы карміць дзяцей, выявіла ў талерцы і ў каструлі рэчыва, падобнае на ртуць. Жанчына выклікала выратавальнікаў і медыкаў. Дзеці, 13 і 14 гадоў, былі шпіталізаваныя. Ім пашанцавала: першапачатковы дыягназ «атручэнне ртуццю» не пацвердзіўся. На кухні праведзена дэмеркурызацыя. Выявілася таксама, што свой тэрмометр гаспадыня бачыла апошні раз прыкладна ў маі.

■ **У складзе экіпажа грузавога самалёта, які разбіўся ў Іраку, знаходзіўся і адзін беларус. Загінулі 6 членаў экіпажа і пасажыр — трое грамадзян Расіі, два — Украіны і па адным — Беларусі і Індыі.**

■ У адным са скавераў Разані невядомыя раніцай 15 лістапада ўзарвалі помнік Леніну, устаноўлены ў адным са скавераў горада. Выбух адбыўся прыкладна ў тры гадзіны ночы, у выніку здарэння ніхто не пацярпеў, але двухметровы помнік разбураны цалкам.

■ **Да сямі гадоў зняволення прысуджаны віцябчанін за вымаганне $1 млн у свайго знаёмага. Зламыснік заманіў чалавека ў падвал свайго дома і там на працягу 19 гадзін прыпальваў паяльнікам пальцы і кісці рук, заганяў пад пальцы шыла, электрадрылем свідраваў каленныя суставы і ступні ног і папросту біў, пагражаючы забіць. У адзін з кароткіх перыядаў адсутнасці ката ахвяры ўдалося развязацца і паведаміць па мабільным тэлефоне, які валяўся на падлозе, у міліцыю пра сваё прыкладнае месцазнаходжанне. На працягу гадзіны пацярпелага вызвалілі, а вымагальніка затрымалі. Па звестках супрацоўнікаў праваахоўных органаў, абодва ўдзельнікі падзей — людзі нябедныя і кожны з іх у свой час трапляў у поле зроку вартавых закона.**

■ Рэгулярнае ўжыванне яблыкаў садзейнічае падаўжэнню жыцця чалавека. З такім сцвярджэннем выступілі брытанскія вучоныя. Яны выявілі ў яблыках складаны элемент, які амалоджвае сэрца, паляпшае цыркуляцыю крыві і павышае ўзровень абароны імуннай сістэмы. Па выніках доследаў з добраахвотнікамі, якія спажывалі значную колькасць яблычнага соку, спецыялісты ўстанавілі, што іх сардэчнасасудзістая сістэма і арганізм у цэлым памаладзелі як мінімум на 17 гадоў. Найбольш карысныя ў гэтых адносінах дзікія яблыкі.

## Поўны абзац

■ **Амерыканская кампанія Celestis аб'явіла аб прыёме заказаў на размяшчэнне крэміраваных парэшткаў на Месяцы. Кампанія прапануе сваім кліентам цэлы спектр паслуг. Так, кошт адпраўкі сімвалічнай порцыі попелу памерлага вагой у адзін грам складае амаль 10 тысяч долараў. Адпраўка астанкаў цалкам не прадугледжваецца. Па словах адміністрацыі кампаніі, першы пробны палёт можа адбыцца ўжо ў 2010 годзе. Зараз кампанія прапануе паслугі па адпраўцы крэміраваных парэшткаў на арбіту Зямлі.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**Жарский сельский исполнительный комитет (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже жилого дома (общ. пл. 47,5 кв.м), расположенного по адресу: Вилейский р-н, д. Стешицы, ул. Набережная, д. 14а. Пл. зем. уч. 0,25 га. Начальная цена – 1 651 970 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Победитель обязан возместить стоимость затрат по подготовке необходимой для проведения аукциона документации в сумме 1 276 170 бел. руб. К участию в аукционе допускаются физические лица – граждане Республики Беларусь. Оплата за объект производится в течение 30 дней с даты проведения торгов. Договор купли-продажи заключается в течение 5 рабочих дней после полной оплаты. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **18.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

**Контактные телефоны (8017) 2246134, (801776) 44616.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015

***УП «Минский городской центр недвижимости»***

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже изолированного помещения (вспомогательное (подсобное) помещение № 1 Н общей площадью 251,14 кв. м, инвентарный номер 500/D-694957), принадлежащего ОАО «Камволь» и расположенного по адресу: г. Минск, ул. Солнечная, д. 30.**

Начальная цена – 732 127 000 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 70 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **19 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **17 декабря 2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

**Телефоны для справок: (017)227 48 36, 227 40 22.**

УНП 190398583.

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует,**

что с 19 ноября 2008 года изменены процентные ставки по вновь заключаемым с физическими лицами кредитным договорам в белорусских рублях и иностранной валюте.

* * *

Более подробную информацию относительно получения кредитов и оказания банком других услуг можно получить в любом учреждении ОАО «АСБ Беларусбанк» или на веб-сайте банка.

**www.belarusbank.by**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

***Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж»***

**ПРОВОДИТ 1 ДЕКАБРЯ 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

***1. О покупке акций на баланс Общества.***
***2. Об оказании спонсорской помощи.***

Акционеры могут ознакомиться с материалами собрания в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 24 ноября 2008 года по адресу: г. Минск, Велосипедный пер., 7 с 8 часов 15 минут до 17 часов, перерыв на обед с 12 часов 30 минут до 13 часов 15 минут.

Место проведения собрания: г. Минск, Велосипедный пер., 7.

Время начала проведения собрания — 11 часов.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 21 ноября 2008 года.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 9 часов до 10 часов 45 минут.

Регистрация участников собрания производится по предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителей акционеров — по доверенности на передачу права участия и голосования на собрании.

**Совет директоров.**

**ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»**
**«27» ноября 2008 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторный аукцион**

**по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности Минского района, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для их обслуживания**

На аукционные торги выставляются предметы аукциона, включающие:

**Лот № 1: Здание амбулатории (инв. № 600/С-93319)** общей площадью 197,3 кв.м, сооружение (забор штакетный), расположенные по адресу: Минская область, Минский район, Колодищанский с/с, п. Колодищи, ул. Полевая, д. 13, **и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания**, площадью 0,1344 га, сроком аренды земельного участка – 99 лет. **Условия использования земельного участка:** для строительства и обслуживания административно-бытового здания. **Начальная цена** предмета аукциона 172 529 659 рублей (в том числе: имущество – 32 974 169 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 139 555 490 рублей). **Сумма задатка** предмета аукциона 15 000 000 руб.

**Лот № 2: Здание амбулатории (инв. № 600/С-93309)** общей площадью 207,6 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Роговский с/с, п. Шершуны, ул. Савенко, д. 2, и **право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания**, площадью 0,1641 га, сроком аренды земельного участка – 10 лет. **Условия использования земельного участка:** для строительства и обслуживания административно-бытового здания. **Начальная цена** предмета аукциона 48 789 100 рублей (в том числе: недвижимое имущество – 33 180 080 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 15 609 020 рублей). **Сумма задатка** предмета аукциона 4 000 000 рублей.

**Продавец недвижимого имущества:** Учреждение здравоохранения «Минская центральная районная больница», расположенное по адресу: Минская обл., Минский район, д. Боровляны, ул. Фрунзенская, 1, тел. 505 27 17, 505 28 86.

**Арендодатель земельного участка:** Минский районный исполнительный комитет.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано **в газете «Звязда» от 9 сентября 2008 г. № 169.**

Минский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

2. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона не позднее 20 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

**Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 26 ноября 2008 г. до 17.00.**

**ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»**
**«26» ноября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит повторный аукцион**

**по продаже объекта, находящегося в собственности Воложинского района, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания**

**На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий: здание начальной школы** (инв. № 632/С-17810), расположенное по адресу: Минская область, Воложинский район, Раковский с/с, д. Выгоничи, общей площадью 125,1 кв.м, и **право заключения договора аренды земельного участка**, площадью 0,1102 га, сроком на 99 лет, отведенного для обслуживания и эксплуатации здания начальной школы. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с нахождением его в прибрежной полосе водного объекта, ручья.

**Начальная цена** предмета аукциона 92 800 890 рублей (в том числе: имущество – 92 707 220 рублей и право заключения договора аренды земельного участка – 93 670 рублей). **Сумма задатка** для участия в аукционе 9 000 000 руб.

**Продавец недвижимого имущества:** Отдел образования Воложинского районного исполнительного комитета, расположенный по адресу: Минская область, г. Воложин, пл. Свободы, 2, тел. (801772) 55607.

**Арендодатель земельного участка:** Воложинский районный исполнительный комитет.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Працоўная слава» от 9 сентября 2008 г. № 109.

Воложинский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

2. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона не позднее 20 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

**Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 24 ноября 2008 г. до 13.00.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

Аукцион по продаже недвижимого имущества коммунальной собственности г. Минска и права заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания состоится **19 декабря 2008 г.** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Организатор аукциона:** Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, тел. (8017) 200 20 89, каб 227.

**На открытый аукцион выставляется:**

| | |
|---|---|
| **Предмет открытого аукциона** | здание специализированное для общественного питания (инвентарный номер 500/С-15244) и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания |
| **Место нахождения недвижимого имущества** | г. Минск, пер. Менделеева Д.И. 1-й, д. 50, корп. 2 |
| **Начальная цена предмета открытого аукциона, рублей** | 951 749 550 рублей (в том числе: недвижимое имущество – 241 778 065, право заключения договора аренды земельного участка – 709 971 485) |
| **Сумма задатка для участия в открытом аукционе, рублей** | 95 174 960 рублей на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества |
| **Продавец недвижимого имущества** | Управление образования администрации Партизанского района г. Минска, 220037, г. Минск, ул. Бумажкова, 37, тел. (8017) 294 63 34, 245 79 80 |
| **Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества** | Общая площадь – 0,1793 га (из них 0,1793 га с ограничениями в использовании – водоохранная зона Слепянской водной системы) кадастровый номер земельного участка – 500000000001004107 |
| **Арендодатель земельного участка и срок аренды** | Минский городской исполнительный комитет, срок аренды – 34 года |
| **Характеристика недвижимого имущества** | Общая площадь – 811,5 кв.м. Год постройки – 1960. Отдельностоящее, одноэтажное здание в неудовлетворительном техническом состоянии, нет оконных и дверных блоков, стены – кирпичные, разрушена система отопления, холодного и горячего водоснабжения. Длительное время не использовалось |
| **Условия использования недвижимого имущества** | Для дальнейшего использования в соответствии с градостроительными регламентами здания под общественную функцию (общественное питание, объект торговли, культурно-бытовое назначение, административно-хозяйственное назначение) |
| **Условия использования земельного участка** | Земельный участок отведен для эксплуатации и обслуживания недвижимого имущества |

Порядок проведения открытого аукциона осуществляется в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**К участию в открытом аукционе допускаются:** граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в открытом аукционе следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка в белорусских рублях;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенную копию свидетельства о государственной регистрации;

юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в открытом конкурсе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителям иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителям гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность.

При подаче документов на участие в открытом аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения. Объект может быть снят с торгов по решению Продавца, Организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

**Заявления на участие в открытом аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 – по рабочим дням, с 18 ноября по 18 декабря 2008 года включительно с 9.00 до 17.00.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решения о предоставлении ему земельного участка обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (в случае предоставления рассрочки ее внесения – часть платы) и возместить расходы, связанные с организацией и проведением открытого аукциона, и расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка. Условия и порядок предоставления рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка определены решением Минского горисполкома от 5 июня 2008 г. № 1308.

В течение одного рабочего дня со дня оплаты права заключения договора аренды земельного участка, возмещения расходов, связанных с организацией и проведением открытого аукциона и формированием земельного участка, победитель аукциона предоставляет Организатору аукциона копии платежных документов, после чего в течение 10 рабочих дней Продавцом заключается с ним договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом договор аренды земельного участка.

Оплата недвижимого имущества производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска на текущий счет № 3600101000044 в ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 795, получатель – финансовое управление Мингорисполкома, УНП 100690830, назначение платежа – 09312. Оплата права заключения договора аренды земельного участка производится в бюджет г. Минска на текущий счет № 3600101000044 в ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 795, получатель – финансовое управление Мингорисполкома, УНП 100690830, назначение платежа – 04002.

До подписания договора купли-продажи победитель аукциона, за исключением иностранного инвестора, обязан в случаях и порядке, предусмотренных законодательством, предъявить Продавцу справку о предоставлении декларации об источниках денежных средств, расходуемых на совершение имущественной сделки.

Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится Продавцом, конт. тел. (8017) 294 63 34, 245 79 80.

Псіхалогія для ўсіх

# САМАЕ ВАЖНАЕ — НЕ РАБІЦЬ «ВАЖНАГА»

**Да Новага года застаецца не так і шмат часу. Нават зусім мала... Але штосьці яшчэ, безумоўна, можна паспець. Напрыклад, спланаваць замежную паездку на калядныя канікулы. А, можа, адважыцца на больш радыкальныя крокі? Восенню, калі ў наваколлі так мала сонца, цеплыні і зялёнага колеру, надта хочацца штосьці змяніць. Ці не варта пачынаць, каб не наламаць дроў? Хто б падказаў, ці будуць радыкальныя крокі, зробленыя да канца гэтага года, на карысць? Спытаем у спецыяліста — сямейнага псіхолага Вольгі АНДРЭЕВАЙ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

1. СПАДЗЯВАЦЦА НА ЛЕПШАЕ?

— Ёсць шэраг бессэнсоўных стэрэатыпаў, напрыклад, «усё да лепшага». Гэта далёка не заўсёды так. І нават, як правіла, не так. Калі вы чакаеце ад будучыні лепшага, значыць, спытайце сябе, што вы для гэтага зрабілі. Чакаеце халявы? Можа быць, гэта ваша асабістая рыса... Лепшага можна чакаць толькі тады, калі вы яго арганізавалі — патрацілі шмат сілаў, энергіі, грошай, аб'ядналі вакол сваёй ідэі шэраг людзей і г.д...

2. ЗМЯНІЦЬ РАБОТУ?

— Увогуле я нікому ніколі не раіла б рабіць рэзкія, адчайныя крокі. Ні на пачатку года, ні напрыканцы... Цяпер жа, калі ў сусветнай эканоміцы назіраецца не зусім спрыяльная і стабільная сітуацыя, непрадуманыя «хістанні» асабліва проціпаказаныя. Іншая справа, калі ў вас ёсць выгадная прапанова, добра прадуманая з усіх бакоў, калі вы рэальна ацанілі перспектыву дадзенага працоўнага месца... Перспектыва асабліва важная. Зараз у інтэрнэце можна адшукаць спіс дзесяці прафесій, па якіх чакаюцца сур'ёзныя звальненні. Абдумайце сітуацыю, каб не аказацца ні з чым. І майце на ўвазе, што хаатычны чалавек атаясамліваецца з ненадзейнасцю, і таму ніколі не пакідае добрага ўражання.

Разлічваеце на павышэнне? Зрабіце так, каб пра гэта даведалася ваша кіраўніцтва. Наўрад ці прасоўванне па кар'ернай лесвіцы чакае чалавека, якога чыста знешне ўсё задавальняе... У сур'ёзных сусветных кампаніях ёсць кансультанты па кар'еры, у якіх з першага дня работы можна даведацца пра перспектывы росту ўнутры дадзенай кампаніі... Калі хочаце зменаў і прафесійнага росту, заявіце пра гэта. З другога боку, не забудзьцеся задаць сабе праўдзівае пытанне: а ці варты я гэтага павышэння? Тое, што я сяджу на адным месцы дваццаць гадоў, не абавязкова азначае, што я добры спецыяліст. Гэта, хутчэй, гаворыць аб тым, што я — не лідар. Трэба разумець, за што менавіта людзей звычайна прасоўваюць, якімі якасцямі яны павінны валодаць, што новага павінны прапаноўваць. А калі вам проста захацелася большага заробку... Выбачайце, лепшыя рабочыя месцы — не для вас.

3. ВЫЙСЦІ ЗАМУЖ (ЖАНІЦЦА)?

— Калі тры месяцы таму падалі заяву, то безумоўна. А імпульсіўных крокаў, зноў жа, рабіць не варта... І не звязвайце, калі ласка, уступленне ў шлюб з нейкімі ажыятажнымі датамі — 08.08.08. Мне гэта нагадвае нейкую масавую істэрыю. Няхай у вас будзе ўнікальны дзень. І наогул: не змешвайце даты — няхай святаў будзе як мага больш...

Уступленне ў шлюб павінна быць вельмі прадуманым крокам. Калі вы здольны жыць з канкрэтным чалавекам не спрабуючы мяняць яго, значыць, ён вам падыходзіць. Вось, скажам, як мы падыходзім да набыцця аўтамабіля? Штудзіруем безліч нейкіх тэхнічных характарыстык, прыглядваемся, узважваем, ацэньваем пакупку з усіх бакоў. Чаму ж мы не такія цікаўныя, калі справа заходзіць аб «характарыстыках» нашага партнёра? Пастаўцеся да шлюбу як да сур'ёзнай інвестыцыі. Як правіла, людзі спадзяюцца на тое, што ўсё будзе добра. І дарэмна. У адваротным выпадку ў нас не было б столькі скасаваных шлюбаў. Паспрабуйце праўдзіва адказаць на пытанне: ці здольны я пражыць з гэтым чалавекам да канца сваіх дзён? Дарэчы, у свеце цяпер назіраецца цікавая тэндэнцыя. Шлюбы становяцца больш кароткімі. Людзі высока цэняць манагамію, прад'яўляюць да адносінаў высокія патрабаванні, і падтрымліваюць гэтыя адносіны толькі да таго часу, пакуль апошнія іх задавальняюць. Іншымі словамі, шлюб становіцца больш якасным, але як толькі яго якасць падае, ён перастае існаваць. Таму калі вы не хочаце страціць партнёра, думайце пра якасць адносінаў. Прычым абодва...

4. ЗАВЕСЦІ ІНТРЫЖКУ?

— Немагчыма штосьці ўтаіць — ні эмацыянальна, ні інфармацыйна. Як бы чалавек ні імкнуўся ўтаіць сваю інтрыжку, яго паводзіны ўсё роўна мяняюцца. Партнёр, якому здраджваюць, можа зрабіць выгляд, што нічога не заўважае тады, калі яму гэта выгадна. Ён прамаўчыць, напрыклад, бо яму не патрэбны разрыў адносінаў, але гэта не азначае, што «раўнадушны» партнёр не будзе пакутаваць. Калі мы робім выгляд, што чагосьці не заўважаем, то мы за гэта ўсё роўна плацім — паніжэннем узроўню самапавагі. Сам жа інтрыган будзе плаціць страхам за тое, што жыве ў хлусні. Той, з кім здраджваюць, будзе плаціць разбурэннем нейкіх сваіх планаў. Нямала прыкладаў, калі мужчына заводзіць інтрыжку з дзяўчынай, якая, хутчэй за ўсё, хоча замуж. Яна «арганізуе» цяжарнасць і потым гадамі «інтрыган» расплачваецца тым, што разрываецца паміж дзвюма сем'ямі.

Я не прыхільнік інтрыжак, таму што яны цягнуць за сабой вялікую колькасць хлусні, з якой пасля трэба жыць. На жаль, інтрыжкі ёсць і будуць. Вы думаеце большасць мужчын на сайтах знаёмстваў — свабодныя? Безумоўна, жанатыя. Проста ў беларускіх мужчын не самы высокі ўзровень вернасці. Нашы шлюбы часта няшчырыя... Калі ж вам чамусьці стала дрэнна ў старым шлюбе, не спяшайцеся ламаць яго, а паспрабуйце зразумець, што ў ім адбываецца. Калі адносіны не памерлі, то з дапамогай спецыяліста іх можна аднавіць, калі ж аджылі сваё, можна дапамагчы такім людзям дастойна разысціся, без псіхалагічных траўмаў, што асабліва важна ў інтарэсах дзяцей.

Хочацца нейкага драйву? Не спяшайцеся заводзіць інтрыжку. Паразважайце над тым, што драйв, якога вам стала не хапаць, — здольнасць канкрэтнага чалавека, канкрэтна вас. Гэта або ёсць унутры нас, і тады мы можам гэта развіваць, або няма, і тады мы сумныя, прымітыўныя, абмежаваныя людзі. Калі чалавеку не хапае цікавых людзей, драйву, трэба штосьці мяняць у сабе. Вучыцца жыць па-іншаму.

5. ЗАРАБІЦЬ ГРОШАЙ?

— Менавіта зарабіць, а не атрымаць заробак! Гэта заўсёды да месца, у любы час года. Праўда, такія фінансавыя крызісы, як цяпер, прымушаюць людзей нервавацца з-за грошай, нават тых, у каго іх, па сутнасці, няма. Я ўсім параіла б супакоіцца, а не доларавым мільянерам — інвеставаць сродкі ў сябе. Скажам, нарэшце, пачаць якасна харчавацца, актыўна адпачываць. І нічога ў вас не «згарыць»... Смешна слухаць, калі людзі скардзяцца на свой мізэрны заробак. Чалавеку плацяць роўна столькі, колькі ён рэальна каштуе. Заробак урача ў многіх краінах вельмі вялікі, але ж і працуюць тамтэйшыя медыкі па-іншаму. На маю думку, некаторым нашым урачам у паліклініках нават пераплачваюць... Рэальны кошт кожнаму з нас як спецыялісту дае рынак працы. Той, хто нечага каштуе, не скардзіцца. Як сказаў нямецкі эканаміст Бода Шэфер, калі вы ўмееце рабіць тое, што ўмеюць рабіць усе, вы каштуеце не больш за пясок у пустыні. Так што калі вы хочаце зарабляць шмат, станьце ўнікальнай прапановай на рынку працы. Гэта не позна зрабіць ні да новага года, ні пасля.

6. ПАЕХАЦЬ «НА КАНІКУЛЫ» ЗА МЯЖУ?

— Каб паехаць на калядна-навагоднія канікулы за мяжу, трэба было звярнуцца ў турфірму яшчэ месяц таму... Чым бліжэй да знакавых падзей, тым менш будзе прапаноў, вышэй кошт і г.д. А Еўропа надта прывабна выглядае ў пераднавагодні час. Лепей за ўсё апынуцца ў тых краях дзесьці снежня 22-га... Калі ёсць жаданне трапіць на кірмашы, распродаж — не пазней 25 снежня, а калі проста дзеля адпачынку, то можна ехаць і пасля 6-7 студзеня.

7. ПАЧАЦЬ ЗАЙМАЦЦА ФІТНЭСАМ?

— Чалавек можа перажываць у паўсядзённым жыцці пастаянны стрэс. Прырода прадугледзела для процістаяння апошняму павышэнне фізічнай актыўнасці. Таму вельмі важна павялічваць нагрузку — але не цяжкасці падымаць, а менавіта рухацца. Падыдуць плаванне, бег, язда на велатрэнажоры, інтэнсіўная хада... Актыўныя дзеянні змяншаюць колькасць стрэсавых гармонаў у арганізме. А для тых, хто спасылаецца на нястачу часу, хачу сказаць наступнае. У тайм-менеджменце ёсць такое паняцце — паглынальнікі часу. Гэта ўсё, што адцягвае нас ад тых спраў, якія сапраўды патрэбна зрабіць. Раю ўзяць блакнот, запісаць, колькі часу вы траціце на той ці іншы занятак. Прааналізуйце сітуацыю, і вы зразумееце, што для вас з'яўляецца паглынальнікам часу. Калі чалавек не паспявае штосьці рабіць, значыць, ён дрэнны менеджар для самога сябе, не эфектыўна выкарыстоўвае час. Жанчынам я параіла б рабіць кар'еру, а не нагружаць сябе хатнімі клопатамі, пакуль іншыя члены сям'і гуляюць у камп'ютарныя гульні...

8. ПАЧАЦЬ РАМОНТ?

— Можна, але не раптам. Восенню-зімой, напэўна, прасцей адшукаць патрэбныя рабочыя рукі, але больш важна, ці ёсць у вас вольны час, каб сачыць за якасцю выканання работ. Традыцыйна рамонт лепш рабіць летам. Ну, проста каб не сапсаваць сабе свята. Паколькі ад рамонту яшчэ доўга трэба адыходзіць.

9. КУПІЦЬ ЛАТАРЭЙНЫ БІЛЕТ?

— Латарэя — вялікі бізнэс, які скіраваны на тое, каб было добра тым, хто ім валодае. Хочаце зрабіць камусьці яшчэ лепш, тады абавязкова купіце. Ва ўсім свеце, дарэчы, каля 11 працэнтаў насельніцтва краін «падсаджваюцца» на латарэі. У нас, мяркую, больш такіх ахвотнікаў. Упэўнена, што на выпадак, латарэю, халяву спадзяюцца інфантыльныя асобы. Я паважаю людзей, якія самі могуць заплаціць за ўсё, што яны хочуць мець.

10. ПАРАІЦЦА З ПСІХОЛАГАМ?

— Калі ласка. Я параіла б правесці аўдыт свайго жыцця. Вазьміце ліст паперы і запішыце ўсе праблемы і незавершаныя справы, якія ў вас ёсць цяпер. Насупраць кожнага пункта напішыце, якім чынам пераадолець сітуацыю... Калі ў вас няма гатовых уласных рашэнняў, звярніцеся да спецыяліста. Так у вас з'явіцца план на наступны год. Калі вы выканаеце нават толькі частку гэтага плана, вы будзеце надзвычай ганарыцца сабой.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Дзяржкантроль

# На паперы і на справе

**На пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці дадзена прынцыповая ацэнка фактаў скажэння дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці і прыпісак у шэрагу сельскагаспадарчых арганізацый.**

У прыватнасці, скормліванне натуральнага малака маладняку буйной рагатай жывёлы і свіней у гаспадарках значна перавышае навуковаабгрунтаваныя нормы. Па сутнасці гэта найбольш распаўсюджаная форма ўтойвання прыпісак валавой вытворчасці малака. Аналіз эфектыўнасці выкарыстання натуральнага малака на выпойванне маладняку буйной рагатай жывёлы ў гаспадарках Шчучынскага раёна паказаў, што яго арганізацыя ў адпаведнасці з навуковаабгрунтаванымі нормамі дазволіла б сельгаспрадпрыемствам атрымаць выручку ў суме 2749,4 мільёна рублёў і 759,1 мільёна рублёў — перапрацоўчым прадпрыемствам.

Устаноўлены факты завышэння прывагаў буйной рагатай жывёлы пры пераводзе кароў дойнага статку ў групу адкорму і прадастаўлення ў органы статыстыкі скажоных звестак аб колькасці жывёлы. Шырокае распаўсюджанне атрымалі факты, калі плошчы збожжавых і зернебабовых культур, выключаныя з уборачнай плошчы і пераведзеныя ў кармавую групу, фактычна ўбіраліся на збожжа, што прыводзіла да завышэння ўраджайнасці гэтых культур.

Па матэрыялах праверак на 18 суб'ектаў гаспадарання накладзены адміністрацыйныя спагнанні на агульную суму 59 мільёнаў рублёў. 17 службовых асобаў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці на агульную суму 27 750 тысяч рублёў, а некаторыя вызвалены ад займаемых пасадаў і асуджаны судом.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Навіны культуры

# Янка Купала звязвае Беларусь і Татарстан

**У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылося падпісанне дамовы з дырэктарам Нацыянальнага музея Рэспублікі Татарстан Гюльчачак Назіпавай.**

Музеі аб'ядноўвае памяць пра вялікага сына беларускага народа Янку Купалу. Падчас Вялікай Айчыннай вайны Іван Дамінікавіч знаходзіўся ў эвакуацыі ў сяле Пячышчы — гэта за 13 км ад Казані. Народны паэт Беларусі Янка Купала жыў там у дырэктара мукамольнага камбіната І. Наякшына.

У сяле Пячышчы дзейнічае музей-кватэра Песняра, захоўваюцца яго асабістыя рэчы. Пра гэта паведаміла дырэктар музея-кватэры Рыма Абызава.

Падпісанае пагадненне будзе спрыяць больш цеснаму супрацоўніцтву ў справе захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і Татарстана. Па словах дырэктара Літаратурнага музея Янкі Купалы Алены Мацевасян, ужо ў 2009 годзе ў Мінску будзе экспанавацца выстаўка, прывезеная з Казані, — аб жыцці пісьменнікаў у эвакуацыі. У сяле Пячышчы наведвальнікі музея-кватэры Янкі Купалы змогуць пазнаёміцца з экспанатамі аб жыцці і творчасці Песняра, якія захоўваюцца ў Беларусі.

**Уладзя ТАЦЦЯНЧЫК.**

## МІЛЬЁНЫ, МІЛЬЁНЫ РУЖ... З-ЗА МЯЖЫ

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці вывучалі сітуацыю на рынку кветкавай прадукцыі ў рэгіёне. Высветлілася, што, на жаль, адзінае дзяржаўнае цяплічнае прадпрыемства «Вясна», што вырошчвае і прадае кветкі, мякка кажучы, не вельмі ўпэўнена адчувае сябе ў гэтай сферы бізнэсу.

З-за мяжы ў рэгіён пастаўляюць кветкі пяць мінскіх фірмаў і толькі адзін мясцовы індывідуальны прадпрымальнік. Усе разам яны фактычна пастаўляюць кветак болей, чым «Вясна», якая ў агульным абароце рэалізуе толькі прыблізна 16 працэнтаў кветкавай прадукцыі. Для параўнання: спецыялісты падлічылі, што за год у рэгіёне можна прадаць кветак на 5 мільярдаў беларускіх рублёў. Усяго ў рэгіёне іх рэалізуюць у 80 гандлёвых пунктах. Падчас праверкі высветлілася, што асобныя пункты не працавалі болей за тыдзень. У рэгіянальным Камітэце дзяржкантролю выйшлі са спецыяльнай прапановай у рэспубліканскі Камітэт. Трэба распрацаваць меры, накіраваныя на развіццё вытворчасці айчыннай кветкавай прадукцыі, а таксама магчымага ўдзелу дзяржаўных прадпрыемстваў у яе імпарце.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## по продаже объектов, находящихся в республиканской собственности, и на право заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

Аукцион состоится **19 декабря 2008 г.** в 15.10 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

**Организатор аукциона:** фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222) 311185, 223375, 311216, 229022.

**Продавцы недвижимого имущества:** по лотам №№ 1–4 – Могилевское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Могилевэнерго», 212030, г. Могилев, ул. Бонч-Бруевича, 3, тел. 8(0222) 293143; по лоту № 5 – республиканское унитарное предприятие электросвязи «Белтелеком», 212030, г. Могилев, ул. Ленинская,12, тел. 8(0222) 292195; по лоту № 6 – Могилевское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 59, тел. 8(0222) 220837; по лотам №№ 7 и 8 – Белорусский государственный концерн по нефти и химии, 220116, г. Минск, ул. Дзержинского, 73, тел. 8(0225) 433012 (по лоту № 7) и тел. 8(0222) 222198, 391826 (по лоту № 8).

Заявления на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **17 декабря 2008 г.** до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона **19 декабря 2008 г.** с 14.00 до 14.50.

| № лота | Сведения о предметах аукциона | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Информация о недвижимом имуществе | | | Информация о земельных участках | | | Начальная цена продажи предмета аукциона, тыс. руб. | Сумма задатка, тыс. руб. |
| | Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена продажи недвижимого имущества, тыс. руб. | Площадь, га | Срок аренды, лет | Начальная цена продажи права заключения договора аренды земельных участков, тыс. руб. | | |
| 1 | **Здание ПС «Ходосы»** одноэтажное кирпичное площадью 107 м² | Могилевская обл., Мстиславский район, д. Ходосы (Сушь) | 40 542,802 | 0,0195 | 20 | 7,672 | 40 550,474 | 4 000,0 |
| 2 | **Здание гаража на 2 автомашины** одноэтажное кирпичное площадью 102,1 м² | Могилевская обл., г. Чериков, ул. Лепешинского, 1 | 5 655,429 | 0,0474 | 25 | 213,626 | 5 869,055 | 580,0 |
| 3 | **Здание двухэтажное** кирпичное площадью 1287 м² | Могилевская обл., Климовичский район, д. Барсуки | 43 241,297 | 0,0994 | 30 | 125,330 | 43 366,627 | 4 000,0 |
| 4 | **Здание общежития № 1** двухэтажное кирпичное площадью 410,21 м²; **здание общежития № 2** двухэтажное кирпичное площадью 409,25 м²; **здание летнего спального корпуса № 3** одноэтажное кирпичное площадью 181,27 м²; **здание столовой** одноэтажное кирпичное площадью 355,84 м²; **здание котельной** одноэтажное кирпичное площадью 108,24 м² | Могилевская обл., Быховский район, д. Проточное | 270 711,462 | 0,6797 и 0,4918 | 30 | 67,027 и 47,051 | 270 825,54 | 27 000,0 |
| 5 | **Здание участка связи** площадью 65,7 м² одноэтажное бревенчатое с дощатой **пристройкой**, дощатыми **верандой и террасой, двумя сараями** блочными площадью 43 м² и 154 м² и дощатым забором площадью 247 м² | Могилевская обл., Могилевский район, д. Любуж, д. 49 | 36 959,851 | 0,3880 | 50 | 9 338,568 | 46 298,419 | 4 600,0 |
| 6 | **Здание аптеки** сборно-щитовое одноэтажное общей площадью 88,1 м²; сарай дощатый одноэтажный площадью 30 м² | Могилевская обл., Белыничский район, д. Большая Мощаница | 23 233,194 | 0,1688 | 30 | 67,276 | 23 300,47 | 2 300,0 |
| 7 | **Здание административно-бытового корпуса** местного предприятия промышленного железнодорожного транспорта двухэтажное кирпичное общей площадью 540 м² | г. Бобруйск, ул. Шинная, 4-б | 41 918,862 | 0,0432 | 99 | 6 658,070 | 48 576,932 | 4 800,0 |
| 8 | **Капитальные строения** (здания, сооружения, передаточные устройства), **машины, оборудование, транспортные средства, инвентарь и деревья плодовые** базы отдыха «Надежда», находящиеся в безвозмездном пользовании по договору у открытого акционерного общества «Могилевский завод искусственного волокна» | Могилевская область, Могилевский район, район д. Межисетки | 1 540 229,443 | 5,2617 и 0,3600 | 50 | 11 785,45 | 1 552 014,893 | 150 000,0 |

**Краткая характеристика имущества, входящего в состав лота № 8:**

Капитальные строения (здания, сооружения, передаточные устройства): склад инвентаря № 3 одноэтажный кирпичный площадью 338,2 кв.м; здание насосной станции над артезианской скважиной № 1 одноэтажное кирпичное площадью 8,2 кв.м; здание для игр одноэтажное площадью 219,6 кв.м, стены – шиферное ограждение, металлический барьер; здание спального корпуса одноэтажное бревенчатое площадью 142,6 кв.м; здание водолечебницы одноэтажное кирпичное площадью 650,1 кв.м; здание столовой одноэтажное кирпичное площадью 456,1 кв.м с дорогой с асфальтобетонным покрытием с площадкой от въездных ворот до столовой площадью 1392,7 кв.м и цветочницей бетонной перед зданием столовой; здание клуба одноэтажное кирпичное площадью 198,9 кв.м с покрытием спортивных площадок из плит ездора площадью 422 кв.м; здание трансформаторной подстанции № 1 одноэтажное кирпичное площадью 14,4 кв.м; здание хлораторной одноэтажное кирпичное площадью 14,6 кв.м; здание насосной станции № 2 одноэтажное кирпичное площадью 11,1 кв.м; склад инвентаря № 2 одноэтажный дощатый площадью 113 кв.м; здание овощехранилища одноэтажное кирпичное площадью 78,9 кв.м; здание склада № 1 одноэтажное кирпичное площадью 100,2 кв.м с дорогой с асфальтобетонным покрытием к складу инвентаря № 1 площадью 200 кв.м; здание котельной одноэтажное кирпичное площадью 214,8 кв.м с площадкой с асфальтобетонным покрытием перед котельной площадью 427 кв.м; здание спального корпуса № 2 двухэтажное кирпичное площадью 796,9 кв.м; здание спального корпуса № 1 двухэтажное кирпичное площадью 794,3 кв.м с дорожкой от столовой до спортплощадки асфальтовой площадью 566 кв.м, дорожкой с асфальтированным покрытием вдоль корпусов площадью 438 кв.м и бетонным сооружением на месте построения; здание административно-лечебного корпуса одноэтажное кирпичное площадью 423,2 кв.м с дорожкой асфальтовой площадью 160,4 кв.м от спальных корпусов к основному и дорожками, площадками из железобетонных плит по территории базы площадью 40 кв.м, 98,8 кв.м, 76 кв.м, 35 кв.м, 31,5 кв.м 54, кв.м и 40,5 кв.м; дом № 2 финского типа одноэтажный сборно-щитовой площадью 60,9 кв.м; дом № 1 финского типа одноэтажный сборно-щитовой площадью 61,2 кв.м; здание трансформаторной подстанции № 2 одноэтажное кирпичное площадью 24,7 кв.м; мост пешеходный через р. Лахва; артезианская скважина № 1 глубиной 50 м; башня водонапорная металлическая емкостью 21 куб.м; септик 3-секционный – металлические конструкции с бетонным основанием и кирпичными стенами; забор деревянный решетчатый протяженностью 253 п.м; ограждение артезианских скважин – металлическая сетка протяженностью 152,5 п.м; артезианская скважина № 2 глубиной 77 м; электрическая сеть протяженностью 2403,8 м (в том числе кабельная линия электропередачи от опоры ВЛ-10 до ТП-1, кабельная линия электропередачи от опоры ВЛ-10 до КТП, воздушная линия электропередачи, электроосвещение по территории базы отдыха); водопроводная сеть протяженностью 753,6 м (в том числе сеть водопроводная от колодца ВК 5 к водонапорной башне и к домикам); канализационная сеть протяженностью 734,8 м (в том числе канализационная сеть от водонапорной башни до КК27, канализационная сеть от КК37 до КК39); тепловая сеть протяженностью 665,8 м (в том числе тепловая сеть к домикам); две емкости для жидкого топлива площадью 4,3 и 23 кв.м. Машины, оборудование, транспортные средства, инвентарь: котел факел-08лж, стерилизатор ГП-40-03, комплексная подстанция, котел отопительный чугунный – 3 шт., горелка ТР-1М, электрообогревательное устройство, ковер 2х4 м, ковер 3х4 м, электросамовар, микшерный пульт, усилитель PS-600, сверлильный станок 2М112, дымосос Д3.5, персональный компьютер МПI430VX/16/НМД1-1.2G/3.5 P-133, принтер EPSON LX-1050, снегоход «БУРАН», насос для воды центробежный АИРВОА2 КМ 8/18 – 4 шт., стиральная машина КП-125-01 УХЛУ, видеокассетный проигрыватель, холодильник «Минск-215», электронасосный агрегат с электродвигателем 2ЭЦВ6-16-70, два трансформатора ТМ 25/10-65, дизель-генератор ДЭС-60р, трансформатор ТСМ-100, киноаппаратура КМ-17, шкаф холодильный ША-1,12, холодильная установка, электрокотел варочный секционный, электроплита 4-камфорная ЭП-2М, горелка с электрощитом – 2 шт., многоярусная печь хлебная, привод ПУ-0,6, универсальный привод ПУ-06, моечная машина ММУ-500, тренажер-стимулятор, биомеханический стимулятор, ингалятор «ТНОМЕХС-2» (Республика Польша) – 4 шт., аппарат для магнитотерапии АВИМП, аппарат УВЧ-50-01, электростимулятор «Стимул», аппарат УЗТ-303Л, электрокардиограф ЭК1К-01, аппарат АМПЛИПУЛЬС-5, аппарат электротепловибропунктуры РЭФИ, аппарат для диагностики УЗТ-101, аппарат для диагностики «Тонус», аппарат для диагностики «Электросон» ЭС-10-5, комплект массажный, устройство для разогрева парафина «Азопир» – 2 шт., ванна ВОД-56, спортивные городки, карусели детские – 6 шт., качели спортивные, кафедра водолечебная, стол однотумбовый – 5 шт., мягкий уголок «Ульянка» – 4 шт., сетка футбольная (комплект из двух единиц), электронасос для перекачки агрессивной жидкости АЭКО 272356, установка компрессорная УК-40-2м, пианино, холодильная установка, стоматологическая установка ПМ2000С, водоподогреватель ПВВ-12. Деревья плодовые: яблони – 40 шт., груши – 16 шт., сливы – 5 шт.

Начальная цена продажи недвижимого имущества по лотам №№ 1–3 и лоту № 7 понижена на 50 процентов, по лоту № 6 понижена на 20 процентов.

Земельные участки, входящие в состав лотов №№ 4 и 8, расположены в водоохранных зонах соответственно Чигиринского водохранилища и реки Лахва, и имеют ограничения в использовании, с перечнем которых можно ознакомиться у организатора аукциона.

Условия для победителей аукциона:

по лотам №№ 1, 3 и 4: в двухмесячный срок со дня государственной регистрации договоров аренды земельных участков получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства (в случае изменения назначения приобретенных на аукционе зданий и сооружений);

по лотам №№ 6 и 7: получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

по лоту № 7: получить заключения по вводу объекта в эксплуатацию в Бобруйской горрайинспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды.

Задатки перечисляются на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык;

представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона.

Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, если:

заявление на участие в нем по конкретному предмету аукциона подано менее чем двумя участниками;

ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;

ни один из его участников в соответствии с решением комиссии по проведению аукциона не был признан победителем.

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После аукциона его участники обязаны вернуть аукционные номера организатору аукциона.

Аукцион начинается с объявления аукционистом порядка проведения аукциона, начальной цены предмета аукциона, его наименования, места нахождения и краткой характеристики недвижимого имущества, условий, с которыми продается данный предмет аукциона (в случае продажи на аукционе с условиями), шага аукциона.

Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Торги начинаются по цене, сформированной с учетом шага аукциона, определяемого аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета аукциона. Очередная цена также определяется и объявляется аукционистом с учетом шага аукциона от предыдущей названной цены предмета аукциона. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на этого участника аукциона. Затем аукционист в соответствии с вышеназванным порядком и шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным словом «продано», а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

При отсутствии участников аукциона, готовых приобрести предмет аукциона по названной аукционистом новой цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион по данному предмету аукциона завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера. Комиссия (организатор аукциона) снимает предмет аукциона с торгов.

Споры, возникшие в ходе проведения аукциона, разрешаются комиссией по проведению аукциона.

Результаты аукциона по конкретному предмету аукциона могут быть аннулированы организатором аукциона в случаях, установленных нормативными правовыми актами.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Срок заключения (государственной регистрации) договоров купли-продажи и договоров аренды земельных участков не позднее 30 декабря 2008 г.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона, а также средства, затраченные организацией по землеустройству на осуществление государственной регистрации изменения земельного участка, из которого изымается часть, или прекращения существования земельного участка.

БЕЛАРУСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ ЎНІВЕРСІТЭТУ ТРАНСПАРТУ — 55

Веньямін СЯНЬКО,
рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту:

# «ВЫПУСКНІК — ЧАСТКА ДУШЫ ЎСЯГО КАЛЕКТЫВУ»

**Калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту за дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці ўзнагароджаны Ганаровым дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 кастрычніка 2003 г. № 443).**

**Сёлета адна з буйнейшых навучальных устаноў краіны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту адзначае свае 55-я ўгодкі. Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту быў утвораны ў 1953 годзе. Высока ацэньваючы работу калектыву і патэнцыяльныя магчымасці ВНУ, у 1993 годзе Урад Беларусі прыняў рашэнне пераўтварыць інстытут ва ўніверсітэт транспарту. На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктар тэхнічных навук, прафесар Веньямін Сянько.**



***— Веньямін Іванавіч, 55 гадоў — значная дата для падвядзення пэўных вынікаў. Разам з тым варта нагадаць, што сёлета — 15 гадоў як Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту быў перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту. З якой мэтай было прынята гэта рашэнне?***

— Вядома, 55 гадоў — гэта знакавая падзея ў жыцці любога калектыву, асабліва вышэйшай навучальнай установы. Мы жывём у век высокіх тэхналогій, «буму» ў будаўнічай галіне. І гэта патрабуе, каб падрыхтаваны ў ВНУ спецыяліст не толькі меў высокую кваліфікацыю, якая адказвала б міжнародным стандартам, але яшчэ быў і грамадзянінам сваёй краіны. Незалежна ад эканамічнай фармацыі дзяржавы адукацыя развіваецца апераджальнымі тэмпамі. Дасягнуць гэтага без сур'ёзнай фундаменталізацыі ўсяго працэсу навучання немагчыма. А гэта ўжо патрабаванні да ВНУ ўніверсітэцкага статусу, што і стала адной з галоўных прычын пераводу Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту ў ранг універсітэта — Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту. Гэта, зразумела, шмат да чаго абавязвае наш калектыў: новыя стандарты, вучэбныя планы, інфармацыйныя тэхналогіі, новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі і г.д.

***— Крытэрый навучання ў любой установе — яе выпускнікі. Наколькі я ведаю, ваш універсітэт выпусціў у свет шмат вядомых у Беларусі і за яе межамі кіраўнікоў розных рангаў. Да прыкладу, выпускнік універсітэта — прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі...***

— Калі кажуць, што славу навучальнай установе прыносяць яе выпускнікі, гэта датычыцца і нас. Выпускнік — частка душы ўсяго калектыву. Яму добра — значыць барометр паказвае на «добра» і ва ўніверсітэце. Пра кожнага з выпускнікоў (30 000 чалавек) можна казаць доўга. На адным з пасяджэнняў, прысвечаным Беларускай чыгунцы, журналіст запытаў, што такое наш выпускнік? Адказ быў адназначным: «Гэта — спецназ Беларускай чыгункі!»

Тым не меней і сярод іх ёсць «зоркі». Гэта — прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь, доктар тэхнічных навук, ганаровы прафесар БелДУТа Сяргей Сяргеевіч Сідорскі, выпускнік электратэхнічнага факультэта; губернатар Гомельскай вобласці Аляксандр Серафімавіч Якабсон, выпускнік факультэта прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва; генеральны дырэктар ВА «Гомсельмаш», кандыдат тэхнічных навук Валерый Аляксеевіч Жмайлік, выпускнік механічнага факультэта; акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Анатоль Іванавіч Свірыдзёнак, выпускнік механічнага фактультэта; Уладзімір Ільіч Жэрала — дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, да нядаўняга часу начальнік Беларускай чыгункі, выпускнік факультэта «Упраўленне працэсамі перавозак»; Герой Сацыялістычнай Працы Яўхім Уладзіміравіч Басін, выпускнік факультэта прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва; Васіль Іванавіч Гапееў — пасол Рэспублікі Беларусь у Казахстане, выпускнік факультэта ўпраўлення працэсамі перавозак; Аляксандр Сцяпанавіч Чыкалёў — дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, выпускнік будаўнічага факультэта і шмат хто яшчэ. З 2002 года ў нас прадукцыйна працуе Апякунскі Савет, які ўзначальвае С. Сідорскі. 95 працэнтаў складу савета — нашы выпускнікі. Гэта, адзначу, зноў жа дастаткова выпрацаваны кантакт у сістэме «выпускнік—універсітэт» і яркі прыклад удзячнасці нашых выпускнікоў універсітэту. Гэта — жывая дапамога ў павышэнні якасці падрыхтоўкі класных спецыялістаў, у выхаванні выпускнікоў як вартых грамадзян нашай дзяржавы.

**З ГІСТОРЫІ**

**1953 год. У інстытуце праведзены набор па трох спецыяльнасцях — эксплуатацыйнай, будаўнічай і механічнай. Так былі названы і адпаведныя факультэты. Па выніках прыёмных экзаменаў на 1-ы курс было залічана 420 чалавек: на дзённае аддзяленне — 329, вячэрняе — 91. Штат прафесарска-выкладчыцкага складу — 20 чалавек. Вучэбны працэс вялі выкладчыкі васьмі кафедраў. Першым рэктарам інстытута быў назначаны заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Узбекскай ССР, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Аляксей Аляксеевіч Петруковіч, які да гэтага працяглы час кіраваў Ташкенцкім інстытутам інжынераў чыгуначнага транспарту.**

**З ГІСТОРЫІ**

**Распараджэннем ад 28 ліпеня 1953 г. № 9866 Савет Міністраў СССР згадзіўся з прапановаю Міністэрства шляхоў зносінаў аб адкрыцці з 1 кастрычніка 1953 года ў г. Гомелі Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту. Ён ствараўся як інстытут усесаюзнага значэння.**

***— Ваша ўласнае жыццё — неадрыўнае ад універсітэта. Сюды вы прыйшлі студэнтам, а ўжо шмат гадоў — рэктар. Ці цяжка параўноўваць сённяшніх і колішніх студэнтаў?***

— Прайшло цяжкіх 37 гадоў перш чым я стаў рэктарам такой дарагой для мяне навучальнай установы. Я ганаруся, што ў маёй працоўнай кніжцы толькі адзін запіс БелЧТ — БелДУТ. Прайшло дастаткова часу, каб ацаніць студэнта 1964 года і 2008-га. Што іх аб'ядноўвае? Гэта, найперш, неабыякавасць да сваёй альма-матар. Сёння студэнт — гэта камп'ютар, інтэрнэт, інфармацыйнае забеспячэнне навучальнага працэсу. Студэнт 1964 года — падручнікі, кансультацыі, праца і яшчэ раз праца. Стартавыя пазіцыі неаднолькавыя, працавітасць — на баку студэнта 1964 года.

***— Якім быў ваш шлях у навуку?***

— Блізкім сябрам, таварышам, зрэдку аспірантам я расказваю пра такі эпізод свайго жыцця. У сакавіку 1970 года мяне, як аспіранта, камандзіравалі па чыгунках СССР для збору матэрыялаў па дысертацыйнай рабоце. У паездцы я быў 29 дзён, даехаў да ваганнага дэпо Хабараўска. Усяго ж абследаваў 16 дэпо. Гэта была дастаткова ўнікальная сітуацыя, і вынікі былі адпаведныя. Працавітасці мне было не займаць.

І другі момант. Мне пашанцавала з навуковым кіраўніком. Я нават сказаў бы — з кіраўніком па жыцці. Такім чалавекам быў і застаецца для мяне Мікалай Захаравіч Крываручка. Усё чаго я дасягнуў — гэта і яго заслуга, хоць ужо даўно яго з намі няма.

***— Вядома, што сёння ў шматлікіх галінах бракуе сапраўдных, апантаных слуг навукі. І найперш — з-за фінансавых праблем. Якім чынам у Гомельскім дзяржаўным універсітэце транспарту вырашаецца праблема падрыхтоўкі вучоных?***

— Праблема падрыхтоўкі вучоных — гэта найважнейшая праблема, з якога б боку яна ні разглядалася, для суверэннай Беларусі. У нас ва ўніверсітэце існуе дастаткова стройная сістэма іх падрыхтоўкі. Штогод ва ўніверсітэце абараняецца 10-12 кандыдацкіх дысертацый і адна-дзве доктарскія. Мы лічым, што гэта дастаткова прыстойна. Ужо на першых курсах праводзіцца пробная селекцыя сярод студэнтаў дзеля ўключэння іх у спіс «таленавітая моладзь». На трэцім курсе мы ўжо прапаноўваем удзельнічаць у выкананні гаспадарча-дагаварных тэмаў у навукова-даследчых лабараторыях, якіх у нас, дарэчы, 11 пры выпускаючых кафедрах. На 4—5 курсах гэтыя студэнты выконваюць курсавыя работы і праекты па тэматыцы навукова-даследчых лабараторый. Далей — магістратура, аспірантура, дактарантура. Запрашаючы студэнтаў да работы ў навукова-даследчыя лабараторыі, мы маем дзве мэты: дапамагчы раскрыццю таленту і падтрымаць матэрыяльна. Асобна неабходна сказаць пра існаванне ў нас сваёй сістэмы імянных стыпендыятаў. З 32 стыпендый толькі 10 фінансуюцца з бюджэту ўніверсітэта, астатнія, якія называюцца ў гонар памяці нашых прафесараў, фінансуюцца з пазабюджэтных сродкаў. Практыка адназначна паказвае, што таленавітыя выпускнікі абавязкова былі ў той ці іншай намінацыі.

**Сёння Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту — адзін з буйнейшых вучэбна-навуковых цэнтраў Беларусі, які складаецца з трох інстытутаў, — вучэбнага, Навукова-даследчага інстытута чыгуначнага транспарту, Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіраўнікоў і спецыялістаў транспартнага комплексу Беларусі.**

І яшчэ адзін момант. У нас працуе два саветы па абароне дысертацый, па дзвюх спецыяльнасцях адчынена дактарантура, па дзесяці — аспірантура. На гэтай базе і функцыянуе сістэма падрыхтоўкі кандыдатаў і дактароў навук.

***— Якія прынцыпы вы б выдзелілі для сябе, як асноўныя?***

— Як рэктар, я выбраў для сябе ў працы тры асноўныя прыярытэты: клопат пра людзей, запатрабаванасць спецыяліста, дысцыпліна.

Мы раней не надавалі належнай увагі выданню вучэбнай і навуковай літаратуры. А вось пасля развалу СССР адчулі нейкі вакуум. Трэба было адказаць на пытанне: якой літаратурай будзем карыстацца — сваёй ці выдадзенай у Расіі альбо ва Украіне. І прынялі рашэнне — сваёй. Мы разумелі, што аўтары падручнікаў, манаграфій, вучэбных дапаможнікаў не маюць матэрыяльнай дапамогі для выдання такой літаратуры. А без матывацыі нельга вырашаць любую задачу. І на савеце ўніверсітэта мы прынялі рашэнне: за выданне манаграфіі аўтар атрымае ўзнагароджанне ў памеры трох акладаў, падручніка — васьмі. Не пакінулі без увагі і матэрыяльную зацікаўленасць калег, якія абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, а таксама іх навуковых кіраўнікоў і кансультантаў. І такі падыход ужо дае пэўны вынік. Працуе і прапанаваная ва ўніверсітэце сістэма матэрыяльнай зацікаўленасці кожнага члена калектыву ў канчатковым выніку. Гэта сістэма дыферэнцыяваная. Кожны павінен ведаць, што калі ён сапраўдны прафесіянал у сваёй справе, то знойдзе вартае месца ў калектыве. Асаблівыя патрабаванні мы прад'яўляем да дысцыпліны. Вось адзін з лозунгаў: спазненне выкладчыка да пачатку лекцыі, практычных заняткаў, лабараторных — надзвычайнае здарэнне. І сістэма працуе.

***— БелДУТ не раз прызнаваўся лепшым сярод ВНУ ў галіне ідэалагічнай працы. Якімі крытэрыямі вы кіруецеся ў першую чаргу? І, калі можна, спыніцеся больш падрабязна на патрыятычным кірунку «Памяць». Давodзілася чуць, што ва ўніверсітэце яму надаецца шмат увагі.***

— З 13 па 16 кастрычніка ў Гомелі праходзіў конкурс па пяці намінацыях на лепшую пастаноўку ідэалагічнай працы сярод ВНУ вобласці. Па ўсіх намінацыях перамаглі праекты, прадстаўленыя нашым універсітэтам. А крытэрый такога поспеху адзін — мы рыхтуем не толькі класнага спецыяліста, але і чалавека, які з упэўненасцю можа сказаць: «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь».

Патрыятычны напрамак «Памяць»... Прыгадваецца 9 Мая 2001 года. Ваенна-транспартны факультэт у поўным складзе, рэктарат, сакратар БРСМ ускладваюць кветкі да магілы воінаў і мірных грамадзян, загінулых у Вялікую Айчынную вайну. Гэта было на могілках па вул. Барыкіна ў Гомелі. Пасля гэтага мы задумаліся — а як справы з пахаваннямі ў Гомельскай вобласці? І сёння кожны факультэт узяў і нясе шэфства над пахаваннямі воінаў, загінулых пры вызваленні таго ці іншага населенага пункта: в. Бацунь Буда-Кашалёўскага раёна (радзіма прарэктара па вучэбнай рабоце Г.М. Чаянковай), в. Агародня Добрушскага раёна (вёска дэкана УПП Н.П. Берліна), вёскі Навасёлкі, Шарсцін, Юркавічы Веткаўскага, в. Ст. Дзятлавічы Гомельскага, в. Борхаў Рэчыцкага раёнаў. Істотна, што некаторыя населенныя пункты — радзіма каго-небудзь з кіраўнікоў універсітэта. Гэта — не выпадковасць, а выбраны напрамак у вялікім спектры выхаваўчага працэсу. Рэакцыя жыхароў гэтых раёнаў уражвае...

***— Як плануеце праводзіць свята?***

— Свята будзе праходзіць у сценах універсітэта. Яму будзе папярэднічаць чарговая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная праблемам транспарту. 21 лістапада ў абноўленай актавай зале пройдзе пашыранае пасяджэнне Навуковага савета, прысвечанае 55-годдзю роднай установы. Затым адбудзецца прыём у рэктара. А 22 лістапада для студэнтаў у гарадскім цэнтры культуры будзе праходзіць святочная дыскатэка. А пакуль: праца, праца, праца...

***— Што асабіста для вас, Веньямін Іванавіч, значыць сёлетні юбілей?***

— Цяперашні юбілей — гэта праверка таго, што зроблена за мінулыя гады, як ідуць справы ў калектыве сёння і якія задачы стаяць на бліжэйшыя гады.

Са святам усіх, хто мае дачыненне да БелЧТа—БелДУТа!

**Гутарыў Міхась ДУБРОВІЦА.**

**БЕЛДУТ**

| | |
|---|---|
| **10 факультэтаў** | **Студэнтаў — 9208** |
| **38 кафедраў** | **Выкладчыкаў — 330** |
| **22 спецыяльнасці** | **188 дацэнтаў і прафесараў** |
| **36 спецыялізацый** | **26 дактароў навук** |

**Агульная плошча — 46 854 метры квадратныя**
**13 лекцыйных аўдыторый**
**98 спецыялізаваных майстэрняў, лабараторый і кабінетаў**
**26 камп'ютарных класаў**
**Чатыры інтэрнаты**
**Спартыўна-аздараўленчы комплекс з 12 заламі, басейн**
**Навукова-тэхнічная бібліятэка налічвае 730 355 тамоў**
**Філіялы ўніверсітэта ў Мінску і Брэсце**
**Прадстаўніцтва ўніверсітэта ў Віцебску**

**З ГІСТОРЫІ**

**У 2003 годзе Беларускі ўніверсітэт транспарту адзначыў сваё 50-годдзе. Кіраўніцтва краіны, Міністэрства адукацыі, мясцовыя органы ўлады па вартасці ацанілі работу калектыву. Два чалавекі былі ўдастоены ганаровых званняў «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» і «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь». Два чалавекі ўзнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны» і Францыска Скарыны, чатыры — медалямі.**

Шык-шок

## Не заўважыць «МАМАНТА» немагчыма



**Фестываль авангарднай моды «Мамант-2008» прадставіў сёлета 21 дызайн-калекцыю ад 20 удзельнікаў, сярод якіх было шмат і непрафесіяналаў — творчых асобаў без спецыяльнай адукацыі па дызайне адзення.**

«Мамант» — фестываль для ўсіх, хто не бачыць межаў для рэалізацыі сябе ў модзе і моды ў сабе. Гэта заўсёды непрадказальнае, шыкоўнае свята яркіх асобаў і для яркіх асобаў.



Гран-пры — стылізаваную статуэтку «Залатога маманта» — атрымалі дастойныя шэдэўры Кацярыны Бурак, прадстаўленыя пад агульнай назвай «Па шляху Сальвадора Далі ў горад антрапаморфных скрыняў». Літаральна праз тыдзень будуць абвешчаны імёны пераможцаў у пяці конкурсных намінацыях — «Ладдзя вечнасці» (за ўнікальнае спалучэнне колеру і формы), «Ледніковы перыяд» (за парадоксы гармоніі), «Гняздо ластаўкі» (за прымяненне інавацыйных тэхналогій), «Лукер'я Камарніца» (за выкарыстанне фальклорных матываў у авангардзе) і «LoLLi Pop» (за лепшую прэзэнтацыю калекцыі).

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**





## ПРА ШТО МАЎЧАЦЬ КАМЯНІ?

**Склалася так гістарычна, што ў Беларусі ва ўсе часы было шмат камянёў. Усё з-за таго, што па тэрыторыі краіны праходзілі мацерыковыя ледавікі. Сёння з камянямі змагаюцца (асабліва на вясковых падворках), знішчаюць, выкідваюць іх, а яны зноў — як з зямлі вырастаюць. Так было і раней. Толькі сёння большасць, злуючыся, зноў ідзе ачышчаць свой агарод ад няпрошаных гасцей. Раней жа іх незразумелага з'яўлення баяліся. Пра камяні складалі легенды і паданні. Цікавыя і незвычайныя. Жахлівыя і павучальныя.**

Шмат у Беларусі існуе паданняў пра тое, як у камяні ператвараліся жывыя істоты. Хтосьці разгнявіў сваіх багоў, хтосьці працаваў у святочныя дні. Можа, гэта былі вяселлі, што не саступілі адно другому дарогі. Прычын шмат знайсці можна. Тыя, хто асабліва захапляецца такімі паданнямі, нават можа ўбачыць у тых камянях твары ці абрысы сапраўдных істот. Кажуць, што па начах чутны галасы з-пад камянёў.

Былі, па паданнях, і цудадзейныя камяні. Яны лячылі сляпых ды глухіх. Было так проста пазбавіцца сваіх праблем — адбіць кавалачак каменя, ці зняць мох з яго, забраць сабе і забыцца на хваробу. Значную сілу, быццам бы, мела вада, што збіралася ў камянёвых паглыбленнях.

Ці шмат хто з сучаснікаў пагодзіцца з тымі вераваннямі і сапраўды будзе хадзіць кланяцца да камянёў? Хутчэй за ўсё, пачнуць казаць пра самаўнушэнне. Цяжка будзе вырашыць, хто мае рацыю, а хто не. Тым не менш сёння гаворка пойдзе пра самыя знакамітыя на Беларусі камяні ды валуны.

**КАМЕНЬ З КНЯЗЕВЫМ ІМЕМ**

Асабліва знакамітыя ў нашай краіне Барысавы камяні. Пра іх мы даведваемся яшчэ са школьных заняткаў па гісторыі. Асноўная іх колькасць знаходзілася на поўначы краіны, у рацэ Заходняя Дзвіна. На іх былі высечаны розныя надпісы. Напэўна, самы знакаміты і даступны для цікаўных Барысаў камень, што знаходзіцца ў Полацку. У 1981 годзе яго прывезлі на Верхні замак і паставілі побач з Сафійскім саборам. Камень важыць 70 тон ды мае ў акружнасці ажно 8 метраў. На ім высечаны вялізны крыж, а па баках надпіс: «ХС. Ника. ГИ (Господи) помози рабу своему Борису». Ля Барысава каменя сустракаецца ды гуляе моладзь. Да яго выпускнікі прыходзяць на досвітку сустракаць узыход сонца. І сёння экскурсаводы забаўляюць турыстаў рознымі легендамі. Кшталту, загадайце жаданне, прыкладзіцеся рукой да каменя, і яно абавязкова збудзецца. Апошнім часам у расшчэліны каменя пачалі засоўваць нават грошы невялікага наміналу. Можа, экскурсаводы новыя казкі прыдумалі, ці хто з мясцовых жыхароў вырашыў падзарабіць?

**ЗНОЎ ГІСТАРЫЧНЫЯ АСОБЫ**

Ёсць на тэрыторыі нашай краіны два камяні (згодна з Турысцкай энцыклапедыяй Беларусі), якія наскрозь прасякнутыя гісторыяй: камень Багушэвіча ды камень Філарэтаў. Абодва — геалагічныя помнікі рэспубліканскага значэння (з 1971 і 1972 гадоў адпаведна).

Камень Багушэвіча знаходзіцца ў Смаргонскім раёне. З-пад зямлі бачны толькі на 1,5 метра ў вышыню. Важыць тая частка, якую можа назіраць падарожнік, ажно 7 тон. Гэты валун быў прынесены ледавіком са Скандынавіі. Збоку на ім высечаны надпіс: «Pamieci Macieja Buraczka 1900 R» (Памяці Мацея Бурачка 1900). Гэты надпіс зрабілі сябры Багушэвіча пасля яго смерці. Ля гэтага валуна класік беларускай літаратуры сустракаўся з сябрамі, хаваў пад ім свае рукапісы ды забароненыя публікацыі.

Другі камень, камень Філарэтаў, — таксама «гістарычная асоба». Ён размешчаны ў Баранавіцкім раёне. Бачная частка ў вышыню дасягае 1,9 метра, а важыць ажно 32 тоны. Трапіў да нас валун са Швецыі. Ля яго сустракаліся ўдзельнікі канспіратыўнага «Аб'яднання філарэтаў», якое было створана студэнтамі Віленскага ўніверсітэта ў 1819 годзе. Гэты камень помніць сустрэчы Міцкевіча і Зана, Чачота, Дамейкі і інш.

**КУДЫ ПАЕХАЦЬ ПА ШЧАСЛІВЫ ШЛЮБ?**

У лесе прыкладна за 2 км ад вёскі Вялікая Валоўшчына (Мінскі раён) знаходзіцца так званы камень кахання. Не такі вялікі ды цяжкі, як папярэднія (вышыня бачнай часткі 1,1 м, яе маса — 22 тоны), ён таксама выхадзец са Скандынавіі. Магчыма, некалі меў і



культавае значэнне. Легенда сцвярджае, што закаханыя, што наведалі гэты камень, будуць шчаслівымі ў шлюбе.

Эх, так і не змагла я пакуль адшукаць на карце гэтую вёсачку. Прапускаю вас наперад. Можа, вы знойдзеце. Толькі абавязкова едзьце разам з каханым.

**ТУТ ІХ ЗБІРАЛІ, А НЕ ВЫКІДВАЛІ**

У Мінску існуе незвычайны музей — музей валуноў. Знаходзіцца ён у мікраараёне Уручча. Правільней казаць, нават не музей, а Эксперыментальная база ледавіковых валуноў. З кансультацыяй па ёй мне дапамог Усевалад Бардон, вядучы навуковы супрацоўнік геалагічнага музея, які ствараецца на базе РУП «Беларускі навукова-даследчы геолагаразведачны інстытут».

Прапанаваў стварэнне такога музея акадэмік Гаўрыла Гарэцкі яшчэ ў 80-х гадах. Быў распрацаваны праект, які зацвердзілі. Праца пачалася.

Група энтузіястаў ездзіла па краіне і збірала найбольш вялікія валуны. Прывозіла іх на вызначанае месца і фарміравала кампазіцыю. Было сабрана каля 2000 валуноў з усёй краіны.

Значнае месца ў экспазіцыі займае сапраўдная вялікая «Карта Беларусі». На мадэлі карты змешчана каля 500 валуноў. На карце ў насыпах адлюстраваны рэльеф Беларусі, пешаходныя сцежкі імітуюць рэкі. Па магчымасці навукоўцы захоўвалі геаграфічны прынцып размяшчэння валуноў: адкуль іх прывезлі, на тым месцы на карце і размясцілі.

Недалёка ад карты размешчана «Петраграфічная калекцыя», якая паказвае разнастайныя пароды магматычнага, метамарфічнага і асадкавага паходжання. Экспазіцыя выканана ў выглядзе круга, падзеленага на чатыры сектары. Унутры гэтых частак размешчаны розныя па складзе валуны.

Асобная тэма — «Камень у жыцці чалавека». Тут знаходзяцца валуны і вырабы з іх, якія маюць важнае гістарычнае і культурнае значэнне для жыхароў нашай краіны: можна ўбачыць камяні-следавікі, каменны крыж, жорны і камяні са знакамі язычніцкіх часоў.

Калісьці планавалася нават пабудаваць асобны будынак на 5 паверхаў, дзе б размяшчаліся музей валуноў і геалагічны музей. Тады ў музей пад адкрытым небам пачалі прыходзіць экскурсіі, фарміраваліся школьныя групы. Музей меў свой план, які размяшчаўся на ўваходзе і дапамагаў асобным наведвальнікам разабрацца ў групах камянёў. Большасць каменных нагрувашчванняў таксама мела невялікія шыльды з подпісамі. Сёння пра тое, што гэта музей, сведчаць толькі назвы прыпынкаў. Як сказаў Усевалад Яўгенавіч, гэтыя шыльды і план зараз ляжаць у падвале. Пасля з'яўлення праз нейкі час іх сапсавалі фарбай і зламалі. Кіраўніцтва паспрабавала адрамантаваць і яшчэ раз размясціць іх — вынік той жа... Атрымліваецца, што маўчыць гэты музей. Нікому нічога не расказвае. Але камяні нічым не горшыя за архітэктурныя помнікі даўніны, вабяць да сябе матуль з дзецьмі, закаханых ды жыхароў мікраараёна...



**Валунамі лічацца камяні з папярочнікам ад 10 см да 3-5 м і болей. Валуны бываюць дробныя, сярэднія, буйныя ды гіганцкія. Усе беларускія валуны — іншаземцы, прынесеныя падчас ледавікоў.**

Апошнім часам, здавалася б, неўміручыя суседзі беларусаў, валуны, пачалі знікаць з Зямлі. Прычына — знішчэнне чалавекам. Валуны ўзрываюць, выкідваюць у рэкі. Такім чынам знішчаецца наша мінулае. Менавіта па гэтых сведках былых часоў вучоныя могуць даведацца, адкуль і як камяні сюды трапілі, якое іх мінулае, колькасць зледзяненняў і шмат іншага. Каб толькі валуны маглі казаць, колькі б цікавых гісторый яны нам паведалі. Жыццё князёў, ваяўнічыя набегі, сяброўскія стасункі. Можа, трэба іх ужо ў Чырвоную кнігу заносіць?

Чалавек жа няшчадна знішчае іх. Успомнім, як вясной мы змагаемся з камянямі на палях ды агародах. Здаецца, кожны год выкідваем іх ды выкідваем, а яны зноў з'яўляюцца. Усевалад Яўгенавіч кажа, што гэта нармальная з'ява. Ва ўсе часы быў свой узровень глебы. Камяні, што з'явіліся на тэрыторыі Беларусі шмат гадоў таму, быццам бы падымаюцца ўверх (растуць) з-пад зямлі. Усё з-за таго, што глебы на нашых агародах становіцца ўсё менш: мы яе пераварочваем, нейкая частка змываецца дажджамі і пераносіцца вятрамі на іншае месца. Такім чынам, падземныя жыхары кожны год дакучаюць нам сваім з'яўленнем.

Дык ці пазнаёмяцца нашы нашчадкі з гэтымі «іншаземцамі»?

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА.**
**Фота аўтара.**





# ПАСЛЯДОЎНІКІ МАЎРОДЗІ ЎЖО Ў ІНТЭРНЭЦЕ

Як нас дураць

## Яшчэ раз пра «бясплатны» сыр

**Банальная сітуацыя: незаконапаслухмянага чалавека, ды яшчэ пад алкагольным «допінгам», пацягнула на «подзвігі». Ён скандаліць у грамадскім месцы альбо, што яшчэ горш, вырывае ў жанчыны сумку з кашальком і мабільным тэлефонам. І, здавалалася б, зусім інакш — у інтэрнэце. Ніякай грубай сілы, прымусу, гвалту. Сядзіш за камп'ютарам, абаронены сценамі сваёй кватэры, націскаеш на клавішы і быццам кіруеш невядомымі табе людзьмі. Перад табой адкрываюцца гіганцкія магчымасці, можна рабіць практычна ўсё. І з табой нічога не здарыцца, паколькі гэта не канкрэтны горад, вуліца, а прастора віртуальная.**

**Менавіта так, пэўна, лічыць пераважная частка зламыснікаў, якія толькі пачынаюць працаваць у сусветнай павуціне. Аднак меркаванне аб беспакаранасці дзеянняў у інтэрнэце злосна жартуе з іх. Прастора віртуальная, але пакаранне за злачынствы рэальнае. І страты ахвяры махлярства — таксама. Так сцвярджаюць на падставе канкрэтных фактаў супрацоўнікі падраздзялення «К» — аддзела па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій УУС Гродзенскага аблвыканкама.**

...Малады чалавек з Ваўкавыска, да прыкладу, пакараны судом да пяці гадоў абмежавання волі, а на карысць пацярпелага з яго спагнана даволі салідная сума фінансавай кампенсацыі. Чым жа вызначыўся гэты дзеяч у сферы высокіх тэхналогій? Аказваецца, яму не спадабалася... канкурэнцыя. Так, канкурэнцыя не ў гандлі нейкімі таварамі, а ў інтэрнэце. Маючы ўласныя сеткавыя рэсурсы, ён хацеў, каб менавіта сюды звярталася як мага больш людзей, і нецярпліва ставіўся да іншых спецыялістаў такога ж плана. Спачатку дзейнічаў метадам перакапання (маўляў, спыніце сваю працу ў гэтай «нішы»), але яны не згадзіліся. І тады — камп'ютарная вайна: у ход пайшла «цяжкая артылерыя» ў выглядзе «бамбардзіроўкі» чужых сайтаў шкоднымі праграмамі. Мэта дасягнутая, канкурэнту патрабуецца даволі шмат часу для аднаўлення працаздольнасці сваіх рэсурсаў.

Як і Шуру Балаганава, «камп'ютарнага» аферыста спынілі на месцы злачынства з адпаведнымі доказамі. З той толькі розніцай, што першы пагарэў падчас крадзяжу ў грамадскім транспарце, а другі — у момант чарговага ўздзеяння на канкурэнтныя сайты.

А вось у 20-гадовага жыхара Скідаля інтарэсы ў сусветнай павуціне былі іншыя. Маючы не надта ўжо і сучасны камп'ютар, ён тым не менш набраўся ў інтэрнэце вопыту і там жа разгарнуў даволі бурную, але, на жаль, процізаконную дзейнасць. Стварыў англамоўны сайт пад выглядам быццам бы зарэгістраванай у ЗША інвестыцыйнай кампаніі і прапанаваў укладчыкам проста шыкоўныя ўмовы па выплаце дывідэндаў. Накшталт таго, як на заранку рынкавых пераўтварэнняў «паляпшалі» дабрабыт насельніцтва сумнавядомы Маўродзі і іншыя прайдзісветы. І рэклама, дарэчы, падобная. Памятаеце, як нахвальвалі «МММ» у тэлероліках шчаслівыя кліенты? Так і цяпер давер да фірмы падмацоўваўся не толькі прыгожа афармленым сайтам, адпаведнымі ліцэнзіямі, але і водгукамі на форуме аб фінансавых магчымасцях кампаніі і разліках з інвестарамі. Несумненна, меркаванні былі выключна станоўчыя. Як потым аказалася, аўтарам усіх каментарыяў з'яўляўся... сам махляр, які выступаў пад рознымі імёнамі. Такім чынам ён «кінуў» даверлівых кліентаў на суму каля дваццаці тысяч амерыканскіх долараў. І спыняцца на дасягнутым не збіраўся, паколькі на момант затрымання арганізаваў у інтэрнэце яшчэ некалькі «інвестыцыйных кампаній». Яго «заслугі» ў гэтай сферы суд палічыў вартымі трох гадоў пазбаўлення волі.

А вось яшчэ адзін махляр (ці, мажліва, злачынная групоўка) пакуль у вышуку. У дадзеным выпадку быў выкарыстаны не камп'ютар, а яшчэ больш распаўсюджаны цяпер сродак высокіх тэхналогій — мабільны тэлефон. Жыхарка аднаго з райцэнтраў Гродзенскай вобласці атрымала SMS-паведамленне, што па выніках латарэі, якая праводзілася на расійскім радыёканале, яна выйграла галоўны прыз. Гэта — аўтамабіль, прычым прэстыжнай мадэлі, вельмі дарагі. Якая ўдача! Праўда, рэаліі такія, што шчаслівчыку трэба пералічыць каля 1200 долараў на пэўны рахунак — быццам для транспарціроўкі машыны ў Беларусь і льготных умоў мытнага афармлення. Падрабязнасці — па ўказаным у SMS-паведамленні нумары тэлефона. Дзяўчына патэлефанавала і, пачуўшы пацвярджэнне, што сапраўды нумару менавіта яе «мабільніка» пашанцавала ў латарэі, пералічыла вышэйпамянёную суму. А далей — ні аўтамабіля, ні грошай, ні магчымасці звязацца з арганізатарамі «латарэі». На сёння ўжо вызначана кола падазроных асобаў і сумесна са спецыяльнымі службамі Расіі праводзіцца расследаванне.

Як патлумачылі ў падраздзяленні «К» УУС Гродзенскага аблвыканкама, у падобных сітуацыях з



нечаканымі выйгрышамі (аўтамабіль альбо іншы каштоўны прыз) махляры дзейнічаюць спосабам так званай веернай рассылкі SMS-паведамленняў, на ўдачу. Калі чалавек падыходзіць з недаверам, не адказвае, то яго проста пакідаюць у спакоі. Калі ж «клюе», то з ім завязваецца дыялог з загадзя падрыхтаванымі і, безумоўна, пераканаўчымі адказамі на ўсе магчымыя пытанні.

А класіка махлярскага жанру ў сферы высокіх тэхналогій — гэта «Нігерыйскія пісьмы». Іх разнавіднасцяў шмат, але сутнасць не мяняецца. Аднойчы на ваш E-mail прыходзіць пісьмо ад афрыканскай лэдзі, якая вас не ведае і тым не менш спадзяецца менавіта на вашу дапамогу. Вы даведваецеся аб трагічным лёсе бежанкі з якой-небудзь афрыканскай краіны ў іншую. Пры гэтым вас запэўніваюць, што пры ўмове пералічэння не надта вялікай сумы грошай можна будзе атрымаць значна больш з валютных рахункаў яе забітага вераломнымі путчыстамі бацькі-міністра. Праявілі зацікаўленасць, адказалі на пісьмо — прыйдзе другое, а затым яшчэ некалькі. Увесь сэнс перапіскі ў тым, каб вы паверылі ў шчырасць няшчаснай «лэдзі» і рэальнасць сітуацыі. А затым... Ёсць рэальныя крымінальныя справы, у тым ліку ў Беларусі, калі махлярам (арганізаваным злачынным групоўкам з добра размеркаванымі абавязкамі) пералічваюць нават дзясяткі тысяч долараў.

Застацца ў дурнях можна і тады, калі на электроннай пошце альбо тэлефоне да вас звяртаецца «адміністратар вашага банка» з просьбай пацвердзіць вашы банкаўскія рэквізіты, дапусцім, для перазаключэння дагавора. Ужо здаралася, што такім шляхам зламыснікі атрымлівалі доступ да электронных рахункаў і кралі грошы. Увогуле, калі пяць гадоў назад былі адзінкавыя выпадкі крадзяжоў грашовых сродкаў з выкарыстаннем украдзеных пластыкавых магнітных картак альбо рэквізітаў электронных банкаўскіх рахункаў, то за дзевяць месяцаў гэтага года толькі на Гродзеншчыне зарэгістравана каля сотні такіх злачынстваў. І вучыцца на чужых памылках хочуць далёка не ўсе. Канфідэнцыяльная інфармацыя па-ранейшаму пакідаецца ў памяці мабільнага тэлефона, які можа быць згублены альбо ўкрадзены, і нават на самой банкаўскай картцы...

**Калі трэба задумацца, што вас «кідаюць»? Парады ад аддзела па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій УУС Гродзенскага аблвыканкама:**

⇨ Калі бачыце прапанову купіць нешта вельмі таннае, паколькі бясплатны сыр, як вядома, бывае толькі ў пастцы.

⇨ Калі паступае прапанова пераслаць няшмат грошай, каб заўтра атрымаць значна больш.

⇨ Калі вам прапануюць бясплатна паўдзельнічаць на аўкцыёне альбо партнёрскай праграме.

⇨ Калі просяць дапамагчы афрыканскай лэдзі атрымаць «...цаць мільёнаў долараў» спадчыны.

⇨ Калі вы не ўдзельнічалі ў латарэі, але раптам сталі ўладальнікам шыкоўнага прыза і, каб яго атрымаць, трэба пералічыць пэўную суму на рахунак арганізатараў гэтай акцыі.

⇨ Калі звяртаюцца з просьбай паведаміць канфідэнцыйную інфармацыю, якая ні ў якім разе не павінна перадавацца іншым асобам.

Такім чынам, першае і самае галоўнае правіла: да любых інфармацыйных паведамленняў фінансавага характару, распаўсюджаных праз інтэрнэт альбо мабільную сувязь, неабходна ставіцца з вельмі вялікім недаверам. Трэба абавязкова праверыць гэта паведамленне: кім яно размешчана? Што гэта за інфармацыйны рэсурс? Усе няпэўныя прапановы лепш проста не разглядаць, а тыя, што заслугоўваюць давер — правяраць самымі рознымі спосабамі. І, перш за ўсё, упэўніцца ў асобе прадаўца, легальнасці фірмы, сабраць па магчымасці поўныя і пажадана з розных крыніц звесткі аб гісторыі іх работы, наяўнасці кампраметуючых абставінаў. У інтэрнэце арудуе шмат аферыстаў, але пераважаюць усё ж прыстойныя людзі, да якіх можна звярнуцца па параду. Хоць і тут, як у выпадку з вышэйпамянёным прадстаўніком «інвестыцыйнай кампаніі», не выключана махлярства.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**9 декабря 2008 г. проводит открытый аукцион № 11-А-08 на право заключения договоров аренды земельных участков**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 6 земельных участков для строительства в г. Минске капитальных строений (зданий, сооружений):

| Лот № | Место расположения земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Функциональное назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Шабаны (микрорайон Шабаны-1) | 500000000002004721 | 0,4793 | Физкультурно-оздоровительный комплекс с объектами общественного питания и сопутствующей торговли | 416 147 815 | 20 807 390 | 3 186 247 | — |
| 2 | Микрорайон Каменная Горка-5 | 500000000006004518 | 0,4466 | Предприятие торговли продовольственными товарами общественного питания (по генплану № 65) | 490 630 470 | 24 531 520 | 3 783 368 | Возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 425 584 бел. руб. |
| 3 | Микрорайон Каменная Горка-5 | 500000000006004520 | 0,3119 | Магазин продовольственных товаров (по генплану № 66) | 342 650 350 | 17 132 520 | 3 675 858 | Возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 287 222 бел. руб. |
| 4 | ул. Скрипникова — ул. Одинцова (микрорайон Красный Бор-II) | 500000000006004385 | 0,5496 | Многоэтажная гараж-стоянка с сервисным центром и помещениями торгового и общественного назначения (по генплану № 87) | 596 034 020 | 29 801 700 | 2 387 675 | Возмещение убытков КУП «УКС Мингорисполкома» в размере 8 642 390 бел. руб. |
| 5 | ул. Янковского — ул. Горецкого — ул. Проектируемая | 500000000006004117 | 1,9073 | Многоуровневая автостоянка на 900 м/м с сервисным центром, объектами торгового и общественного назначения (по генплану № 14) | 2 110 846 656 | 105 542 330 | 5 614 250 | Возмещение убытков ОАО «Мапид» в размере 121 539 450 бел. руб. |
| 6 | ул. Матусевича (микрорайон Масюковщина-3) | 500000000006004109 | 0,3754 | Крытые теннисные корты с помещениями общественного питания и физкультурно-оздоровительного обслуживания населения | 406 867 680 | 20 343 380 | 2 900 912 | — |

Земельные участки свободны от застройки. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **9 декабря 2008 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

внести задаток в размере 5 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, победивший в торгах, либо которому земельный участок предоставляется по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, обязан произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение в размере 4 % от начальной цены предмета торгов и 5 % от суммы превышения цены продажи соответствующего лота над его начальной ценой.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с **9.00 19 ноября 2008 года** и заканчивается в **17.00 3 декабря 2008 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются по начальной цене в случаях, предусмотренных законодательством) обязаны:

в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;

в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона:

- произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение, включающую возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, в размере 4 % от начальной цены предмета торгов и 5 % от суммы превышения цены продажи соответствующего лота над его начальной ценой.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату платежа. По заявлению победителя аукциона, Минский горисполком, может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в порядке, установленном соответствующей инструкцией, утвержденной решением Мингорисполкома от 05.06.2008 № 1308.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен в установленном порядке, обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого, по решению исполкома, ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 4, 6.

**Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.**

**Дополнительная информация о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов www.mgcn.by.**

УНП 190398583


# РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## Аб тэрміне дзеяння даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) фізічнай асобы, адкрытага ў банку, на які пералічваецца пенсія (дапамога)

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка старшыні Марыскіна А.У., суддзяў Бойка Т.С., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Сяргеевай В.Г., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П., Шукліна В.З. разгледзеў зварот адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк» аб праверцы палажэнняў нарматыўнага прававога акта, што ўстанаўлівае гадавы тэрмін дзеяння даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) фізічнай асобы, адкрытага ў банку, на які органамі па працы і сацыяльнай абароне пералічваюцца пенсіі (дапамогі).

Прааналізаваўшы палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ГК), Банкаўскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — БК), Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні» (далей — Закон), іншых нарматыўных прававых актаў Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць пытанні пенсійнага забеспячэння, Канстытуцыйны Суд устанавіў.

Згодна з артыкулам 47 Канстытуцыі грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на сацыяльнае забеспячэнне ў старасці ў выпадку хваробы, інваліднасці, страты працаздольнасці, страты карміцеля і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам.

У Законе ўстаноўлены парадак рэалізацыі грамадзянамі канстытуцыйнага права на атрыманне працоўных, сацыяльных пенсій і іншых выплат шляхам вызначэння крыніц выплаты пенсій, арганізацый, куды на выбар пенсіянераў пералічваюцца пенсіі, і іншых умоў іх выплаты.

Так, у артыкуле 8 Закона прадугледжана, што выплата працоўных пенсій, назначаных у адпаведнасці з Законам, ажыццяўляецца са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. Выплата сацыяльных пенсій, прадугледжаных Законам, ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

У адпаведнасці з падпунктамі 6.35 і 6.49 пункта 6 Палажэння аб Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 2001 г. № 1589, на ўказанае Міністэрства ўскладзены ў тым ліку арганізацыя работы па назначэнні і выплаце пенсій, дапамог і іншых сацыяльных выплат; ажыццяўленне кантролю за рэалізацыяй заканадаўства аб сацыяльнай абароне насельніцтва і інш.

Згодна з часткай чацвёртай артыкула 83 Закона выплата пенсій праводзіцца на выбар пенсіянера праз арганізацыі паштовай сувязі, банкі, арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па дастаўцы пенсіі.

Асаблівасці выплаты пенсіі (дапамогі) праз банкі ўстаноўлены, у прыватнасці, Палажэннем аб парадку выплаты пенсій (дапамог) шляхам пералічэння на рахункі фізічных асобаў у падраздзяленні адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк», зацверджаным пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 3 кастрычніка 2002 г. № 129 (далей — Палажэнне). У пункце 4 Палажэння прадугледжана, што пералічэнне пенсіі (дапамогі) ажыццяўляецца органам па працы і сацыяльнай абароне на падставе заявы пенсіянера (атрымальніка дапамогі) аб пералічэнні яго пенсіі (дапамогі); заява сапраўдная на працягу трох гадоў з дня яе падачы ў орган па працы і сацыяльнай абароне і аднаўляецца пенсіянерам (атрымальнікам дапамогі) не пазней чым за адзін месяц да заканчэння тэрміну яе дзеяння.

Выплата пенсіі (дапамогі) шляхам пералічэння на рахунак фізічнай асобы мае істотныя адрозненні ад іншых спосабаў яе атрымання. У гэтым выпадку грамадзянін самастойна заключае з банкам дагавор адпаведнага банкаўскага ўкладу (дэпазіту). Умовай такога ўкладу з'яўляецца захоўванне грашовых сродкаў, распараджэнне імі і атрыманне працэнтаў. Папаўненне ўкладу праводзіцца залічэннем на рахунак укладчыка як пенсіі, так і сум, што паступілі ва ўклад шляхам унясення наяўных грашовых сродкаў і (або) у безнаяўным парадку.

Указаныя праваадносіны, звязаныя з заключэннем дагавора банкаўскага ўкладу (дэпазіту) і адкрыццём рахунку фізічнай асобы, куды паступаюць грашовыя сродкі, атрыманыя грамадзянінам у законным парадку, а таксама з наступным валоданнем імі, карыстаннем і распараджэннем, сведчаць аб наяўнасці ў грамадзяніна права ўласнасці на гэтыя грашовыя сродкі і рэгулююцца грамадзянскім і банкаўскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Так, у артыкуле 773 ГК, артыкулах 181 і 185 БК прадугледжаны адпаведна абавязак банка, які з'яўляецца ўкладаатрымальнікам, прыняць ад укладчыка грашовыя сродкі ва ўклад (дэпазіт), забяспечыць іх захаванасць, выплаціць працэнты на ўмовах і ў парадку, вызначаных дагаворам, а пры спыненні дагавора — вярнуць іх укладчыку. Грашовыя сродкі носяць абезлічаны характар, і ўкладчык мае права распараджацца імі: даваць даручэнні банку аб пералічэнні грашовых сродкаў з яго рахунку на іншыя банкаўскія рахункі і (або) іншым асобам; карыстацца іншымі відамі банкаўскіх паслуг у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і дагаворам банкаўскага ўкладу (дэпазіту). Згодна з артыкулам 189 БК ва ўклад (дэпазіт) могуць залічвацца грашовыя сродкі, якія паступілі на рахунак укладчыка ад іншых асобаў, калі іншае не прадугледжана дагаворам банкаўскага ўкладу (дэпазіту).

Аналагічныя падыходы знайшлі адлюстраванне ў Палажэнні. У ім прадугледжана, што выдача грашовых сродкаў з рахункаў фізічных асобаў праводзіцца ў адпаведнасці з банкаўскім заканадаўствам (пункт 13); на сумы пенсій (дапамог), залічаныя на рахункі фізічных асобаў у падраздзяленнях банка, пенсіянерам (атрымальнікам дапамог) налічваецца даход у выглядзе працэнтаў або ў іншай форме, якая прапаноўваецца банкам, у адпаведнасці з банкаўскім заканадаўствам (пункт 3).

Абарона права ўласнасці грамадзяніна на грашовыя сродкі, размешчаныя ва ўкладзе (дэпазіце), адпавядае артыкулу 44 Канстытуцыі, які прадугледжвае, што дзяржава гарантуе кожнаму права ўласнасці; уласнік мае права валодаць, карыстацца і распараджацца маёмасцю як аднаасобна, так і сумесна з іншымі асобамі; уласнасць, набытая законным спосабам, ахоўваецца дзяржавай; дзяржава заахвочвае і ахоўвае зберажэнні грамадзян, стварае гарантыі вяртання ўкладаў.

На ўказаных падыходах заснаваны і нормы ГК, якія рэгулююць, у прыватнасці, пытанні прадстаўніцтва і даверанасці (артыкулы 183—190).

У адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам тэрмін дзеяння даверанасці не можа перавышаць трох гадоў (пункт 1 артыкула 187 ГК). Такім чынам, грамадзянскім заканадаўствам фізічнай асобе прадастаўлена права ў межах трох гадоў вызначаць тэрмін дзеяння даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту).

Разам з тым у артыкуле 87 Закона прадугледжана, што даверанасць на атрыманне пенсіі можа быць выдадзена на тэрмін не больш за адзін год. У пункце 17 Палажэння таксама ўстаноўлены гадавы тэрмін дзеяння даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў з рахунку пенсіянера ў банку.

У адказе на запыт Канстытуцыйнага Суда Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ўказала, што банкі пры выплаце пенсіі павінны кіравацца артыкулам 87 Закона, які вызначае гадавы тэрмін дзеяння даверанасці (пісьмо ад 18 чэрвеня 2008 г. № 06-10/3349п).

Паводле меркавання Канстытуцыйнага Суда, адносіны, звязаныя з атрыманнем пенсіі (дапамогі) па даверанасці, і адносіны па распараджэнні банкаўскімі ўкладамі (дэпазітамі) на падставе даверанасці па сваёй прававой прыродзе — розныя праваадносіны. Яны з'яўляюцца адносінамі, якія рэгулююцца ў першым выпадку пенсійным заканадаўствам, а ў другім — грамадзянскім і банкаўскім заканадаўствам.

Такім чынам, можна зрабіць выснову аб тым, што артыкул 87 Закона рэгулюе пытанні, якія ўзнікаюць у працэсе выдачы даверанасці на атрыманне пенсіі ў арганізацыях, што ажыццяўляюць дзейнасць па дастаўцы пенсіі, а таксама паштовай сувязі. Праваадносіны па выдачы даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў, якія захоўваюцца ва ўкладзе (дэпазіце) фізічнай асобы, па сваёй сутнасці з'яўляюцца грамадзянска-прававымі і рэгулююцца не артыкулам 87 Закона, а пунктам 1 артыкула 187 ГК. У сувязі з гэтым артыкул 87 Закона, які вызначае гадавы тэрмін дзеяння даверанасці, не можа і не павінен распаўсюджвацца на выпадкі атрымання грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) грамадзяніна, адкрытага ў банку, на які пералічваецца яго пенсія (дапамога), як тыя, што падпадаюць пад дзеянне нормаў грамадзянскага і банкаўскага заканадаўства.

З улікам выкладзенага Канстытуцыйны Суд лічыць, што пункт 17 Палажэння ў частцы ўстанаўлення гадавога тэрміну дзеяння даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў з рахунку пенсіянера ў банку не адпавядае нормам грамадзянскага і банкаўскага заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

У той жа час для выключэння магчымых негатыўных вынікаў, якія могуць быць выкліканы акалічнасцямі, што цягнуць за сабой спыненне выплаты пенсій (дапамог), у мэтах абароны эканамічных інтарэсаў дзяржавы, забеспячэння мэтавага выкарыстання сродкаў сацыяльнага страхавання на выплату пенсій (дапамог), кантролю за іх расходаваннем, паводле меркавання Канстытуцыйнага Суда, у Палажэнні можа быць устаноўлены як гадавы, так і іншы тэрмін дзеяння заявы пенсіянера (атрымальніка дапамогі) аб пералічэнні пенсіі (дапамогі) на яго рахунак, адкрыты ў банку.

На падставе выкладзенага, кіруючыся артыкуламі 40, 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкуламі 22, 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Канстытуцыйны Суд

**ВЫРАШЫЎ:**

1. Прапанаваць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь разгледзець пытанне аб удасканальванні нормаў пенсійнага заканадаўства шляхам замацавання ў артыкуле 87 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні» палажэння аб тым, што ўказаны ў ім тэрмін дзеяння даверанасці не распаўсюджваецца на выпадкі атрымання грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) грамадзяніна, адкрытага ў банку, на які пералічваецца яго пенсія (дапамога).

2. Звярнуць увагу Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь на неабходнасць унясення змяненняў у пункт 17 Палажэння аб парадку выплаты пенсій (дапамог) шляхам пералічэння на рахункі фізічных асобаў у падраздзяленнях адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк», зацверджанага пастановай ад 3 кастрычніка 2002 г. № 129, што вызначае гадавы тэрмін дзеяння даверанасці на атрыманне грашовых сродкаў з укладу (дэпазіту) фізічнай асобы, на які пералічваецца яго пенсія (дапамога), з улікам нормаў грамадзянскага і банкаўскага заканадаўства Рэспублікі Беларусь, а таксама падыходаў, выкладзеных у гэтым рашэнні.

3. Гэта рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

4. Апублікаваць гэта рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Старшынствуючы —
**Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь**
**П.П. МІКЛАШЭВІЧ**

*6 лістапада 2008 г., г. Мінск*
*№ Р-299/2008*

# З КІРМАША




## «НЕ ЗАЎВАЖЫЎ, БО НЕ БЫЛІ АБАЗНАЧАНЫ»

Здарэнні

**У суботу ў 18.30 22-гадовы мінчанін у сталіцы наехаў на машыне «Фальксваген Гольф» на пешаходаў, якія чакалі на астраўку бяспекі зялёнага сігналу святлафора для пераходу праезнай часткі. У выніку наезду жанчыны ва ўзросце 57, 71, 77 гадоў атрымалі пераломы, раны і ўдары.**

— Вадзіцель патлумачыў, што яго асляпіла святлом фараў машына, якая ехала насустрач. З-за гэтага пешаходаў ён прыкмеціў за 5-6 метраў, рэзка націснуў на тормаз, але, зразумела, кароткая адлегласць не дазволіла пазбегнуць наезду. Акрамя таго, віноўнік сцвярджае, што не заўважыў пешаходаў яшчэ і таму, што яны не былі абазначаны флікерамі, — расказвае старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ Савецкага РУУС горада Мінска Вольга Суворава. — Вядзецца праверка.

**Надзея ДРЫЛА.**

